РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

28 ЛІСТАПАДА 2025 г. ПЯТНІЦА № 230 (30618)




Фота БелТА

# «БЕЛАРУСЬ ВЫСТУПАЕ ЗА СУМЛЕННЫ І АДКРЫТЫ ДЫЯЛОГ ПА ВАЖНЫХ МІЖНАРОДНЫХ ПЫТАННЯХ»

**Падрабязнасці ўдзелу Прэзідэнта ў саміце АДКБ**

СТАР. 2—4




КУРС — НА СТВАРАЛЬНУЮ ПРАЦУ 5




«КАСМІЧНЫЯ» МАГЧЫМАСЦІ КАЛЕДЖА 8—9



«З ДОБРАЙ ПАРАЙ!» — НОВЫЯ ПРЫЗЫ АД «ЗВЯЗДЫ» 16



+TV ПРАГРАМА
«СЦЕРАЖЫСЯ АЎТАМАБІЛЯ»

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby.
Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X

# «БЕЛАРУСЬ ВЫСТУПАЕ ЗА СУМЛЕННЫ ПА ВАЖНЫХ МІЖНАРОДНЫХ

## Падрабязнасці ўдзелу Прэзідэнта ў

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў Бішкеку 27 лістапада прыняў удзел у саміце Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы. Саміт прайшоў у адміністрацыйным будынку «Ынтымак Орда», куды, як паведамляе тэлеграм-канал «Пул Першага», беларускі лідар прыбыў першым з удзельнікаў. Кіраўніка беларускай дзяржавы па прыбыцці вітаў Прэзідэнт Кыргызстана Садыр Жапараў.**



Фота БелТА.

### «ЗАХОДНІЯ ПАЛІТЫКІ МЭТАНАКІРАВАНА РЫХТУЮЦЦА ДА ВАЙНЫ»

«Мы з'яўляемся сведкамі тэктанічных зрухаў у міжнародных адносінах», — сказаў Прэзідэнт Беларусі падчас пасяджэння ў вузкім складзе. Кіраўнік дзяржавы канстатаваў, што шматбаковыя механізмы кантролю над узбраеннямі альбо цалкам разбураныя, альбо страцілі сваю эфектыўнасць з-за канфрантацыі і адсутнасці даверу.

«Па перыметры граніц АДКБ нарастаюць ваенныя рызыкі і пагрозы, асабліва на заходнім флангу арганізацыі, дзе, здавалася б, павінна захоўвацца адэкватная і стабільная сітуацыя. Абстаноўка падобная на абложаную крэпасць, у якой сёння жыве Беларусь», — сказаў Прэзідэнт. «Еўрапейскія краіны фактычна пераводзяць сваю эканоміку на ваенныя рэйкі, нарошчваюць інвестыцыі ў абаронную прамысловасць, павялічваюць аб'ёмы вытворчасці ўзбраенняў. Мы ў АДКБ павінны на гэта рэагаваць і рэагуем», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Ён адзначыў, што сукупныя выдаткі краін НАТА на абарону ў 2025 годзе складуць каля 1,6 трыльёна долараў. Растуць ваенныя амбіцыі Германіі, якая мае намер сур'ёзна павялічваць ваенныя выдаткі. Польшча, у сваю чаргу, у 2026 годзе выдзеліць на абарону амаль 55 мільярдаў долараў (каля 5 % ВУП) і стане лідарам НАТА па гэтым паказчыку. Колькасць яе Узброеных Сіл ужо перавысіла 200 тысяч чалавек. Па тэмпах росту не моцна адстаюць ад Варшавы і краіны Балтыі.

«Усё вышэйпералічанае ў сукупнасці з агрэсіўнай рыторыкай сведчыць пра тое, што заходнія палітыкі мэтанакіравана рыхтуюцца да вайны. Не мы, Уладзімір Уладзіміравіч (Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін. — **«Зв.»**), рыхтуемся да вайны, а па ўсіх фактах — яны», — заявіў кіраўнік дзяржавы. Ён таксама звярнуў увагу, што краіны Захаду працягваюць напампоўваць зброяй Украіну. «Дзе гэтая зброя сёння знаходзіцца, усім зразумела: па ўсім свеце расцякаецца», — заўважыў беларускі лідар.

У сваім выступленні Прэзідэнт падкрэсліў, што, нягледзячы на выклікі і пагрозы, Беларусь выступае за сумленны і адкрыты дыялог па важных міжнародных пытаннях. «Акрамя нарошчвання ваеннага патэнцыялу, нашы суседзі актыўна прапаведуюць палітыку ізаляцыі і раздзяляльных ліній. Спектр найшырэйшы: ад незаконных эканамічных санкцый да закрытага неба і закрытых граніц, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Адначасова мы — за дыялог. І гэта дэманструем у сваёй палітыцы. Сумленны, адкрыты, без ультыматумаў і папярэдніх умоў».

### «АДКБ ЗАХОЎВАЕ СВАЮ АКТУАЛЬНАСЦЬ»

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ў перыяд свайго старшынства ў АДКБ у 2023 годзе Беларусь ініцыіравала Мінскую міжнародную канферэнцыю па еўразійскай бяспецы, прапанаваўшы пляцоўку для навядзення мастоў і пошуку кампрамісных рашэнняў у мэтах пераадолення рознагалоссяў у рэгіёне. «АБСЕ не працуе. Даўно можна было сабрацца кіраўнікам дзяржаў і пагаварыць на гэтую тэму. Але камусьці не хочацца», — заўважыў беларускі лідар.

У канцы кастрычніка гэтага года праведзена ўжо III Мінская канферэнцыя, якая становіцца пастаянным форумам для абмеркавання надзённых пытанняў рэгіянальнай і глабальнай бяспекі для Еўразіі. «У сучаснай канфігурацыі бяспекі на еўразійскай прасторы АДКБ захоўвае сваю актуальнасць. АДКБ патрэбна. Запатрабаванасць нашай арганізацыі пацвярджаецца дынамічным развіццём усіх яе складнікаў: ваенна-палітычнага, ваенна-тэхнічнага, у сферы барацьбы з транснацыянальнымі пагрозамі», — заявіў Прэзідэнт.

«Трэба пастаянна адаптаваць АДКБ пад зменлівыя выклікі і пагрозы бяспекі, каб яна своечасова і максімальна эфектыўна рэагавала на іх. З ваенным кампанентам, антыкрызісным інструментарыем, барацьбой

# «ТРЭБА ПРЫНЯЦЬ УЗВАЖАНАЕ

## Аб чым Прэзідэнт гаварыў з журналістамі

**Можна лічыць, што мерапрыемства для журналістаў розных краін не адбылося, калі яны не атрымалі эксклюзіўны каментарый Прэзідэнта Беларусі. Пасля заканчэння саміту АДКБ Аляксандр Лукашэнка шчыра пагутарыў з журналістамі.**

### «ТРАМП І ЯГО КАМАНДА ГРУНТОЎНА І ЗМЯСТОЎНА ПРАВЯЛІ ВЕЛЬМІ ВЯЛІКУЮ ПРАЦУ»

Адказваючы на пытанне аб мірным плане ЗША па ўрэгуляванні канфлікту ва Украіне, кіраўнік дзяржавы заўважыў, што ў ім трэба прапісаць усё да дробязі. «Учора мы вельмі доўга гаварылі на гэту тэму з Уладзімірам Уладзіміравічам (Пуціным. — **«Зв.»**). Я так разумею, і ён, і я бачым пакуль незканчатковы варыянт і, калі можна так сказаць, неафіцыйны варыянт. Калі ён будзе перададзены па афіцыйных каналах расіянам, тады можна будзе гаварыць аб канкрэтных нейкіх рэчах, — заявіў беларускі лідар. — Але я сёння сказаў, што план працаздольны. І Уладзімір Уладзіміравіч прызнае, што гэта добрая аснова для перагавораў».

Разам з тым Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што гэты план складзены ў спешцы: «Няхай на мяне не пакрыўдзіцца каманда Трампа, але ён (план. — **«Зв.»**) складзены ў спешцы. Не хачу сказаць, што ўжо зусім на калене, але ў спешцы. Яго трэба прадставіць у зразумелым варыянце. Без шырокага тлумачэння, каб усё было канкрэтна. Калі там тэрытарыяльныя нейкія вырашаюцца пытанні, то ўсё павінна быць прапісана да метра, кіламетра. Якія войскі, дзе войскі, хто павінен быць, хто не павінен, — падкрэсліў беларускі лідар. — Усё павінна быць да дробязі прапісана. Шырокае тлумачэнне дазволіць потым у нейкім перыядзе часу... Па-свойму кожны будзе тлумачыць тыя ці іншыя пункты. Таму павінна быць абсалютна ўсё канкрэтна».

Паводле яго слоў, у цэлым амерыканцамі праведзена каласальная работа. Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка пракаментаваў шэраг выказванняў экспертаў і журналістаў, якія кажуць, што ЗША, напрыклад, улічылі патрабаванні Расіі, а ўкраінскія, наадварот, не ўлічваюцца. Прэзідэнт у сувязі з гэтым звярнуў увагу, што Дональд Трамп не толькі сустракаўся з Уладзімірам Пуціным у Анкарыджы, але і правёў шмат сустрэч з Уладзімірам Зяленскім, з еўрапейскімі лідарамі.

«Вы што, думаеце, яны проста гарбату папілі? Трамп і яго каманда грунтоўна і змястоўна правялі вельмі вялікую работу. І з украінцамі, і з еўрапейцамі, і з расіянамі. І трэба Трампу аддаць у гэтым плане належнае. Таму казаць пра тое, што меркаванне і пазіцыю Расіі ўлічылі, а Украіны не, — гэта няправільна», — сказаў Прэзідэнт. Ён адзначыў, што пытанне ў іншым: Расія аказалася больш дагавораздольнай, чым Украіна. «Гэта трэба прызнаць. А потым ужо ўглыб лезці», — даў параду «аналітыкам» кіраўнік дзяржавы.

### «КАЛІ Б УКРАІНА ВЫКАНАЛА МІНСКІЯ ДАМОЎЛЕНАСЦІ, ВАЙНЫ Б НЕ БЫЛО»

Гаворачы пра Уладзіміра Зяленскага, Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што калі б ён у пачатку ваенных дзеянняў паслухаўся парад, то не дайшло б да цяперашняй сітуацыі наогул. «А калі б Украіна выканала Мінскія дамоўленасці, вайны б не было. І Украіна была б у граніцах, як яны хочуць, 1991 года. Але калі Валодзя Зяленскі хоча паглядзець на рэаліі, я цяпер яму яшчэ раз, калі аказалася, што я тады меў рацыю, хачу не параду даць — хачу проста сказаць тое, што бачу я. Калі ты хочаш, каб Украіна захавалася ў тых рамках, у якіх яна сёння ёсць (з улікам рэалій на фронце), трэба дамаўляцца, не трэба тарпедаваць перагаворны працэс», — заклікаў беларускі лідар.

«Калі дзесьці нешта не можаце дамовіцца... А я з гэтай прапановы не ўбачыў, што там нельга дамовіцца па нейкіх пытаннях. Ну калі раптам... Там нейкая дэмілітарызаваная зона, кавалачкі і гэтак далей, на Данбасе... Ну пакіньце на потым, але спыніце вайну, дзе гінуць чужыя дзеці. Вось у чым галоўная праблема таго ж Зяленскага. Гэта трэба мець на ўвазе. І, самае галоўнае, ты страціш краіну», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт не выключыў, што Уладзімір Зяленскі зможа і ў гэтай сітуацыі знайсці ў свеце месца для жыцця сабе і блізкім.

> **«А што будуць рабіць украінцы? Мільёны чалавек. Таму падумай, зыходзячы з рэальнай абстаноўкі, як захаваць тое, што ў цябе ёсць. А ў цябе ёсць усё: і выхад да мора, і Адэса твая, і Нікалаеў. А гэтага можа не быць. У адно імгненне, у адно імгненне. Таму трэба ўсё ўзважыць і прыняць узважанае рашэнне. І Трамп тут мае рацыю, калі ён падціскае адзін і другі бакі», — сказаў беларускі лідар.**

### «У ГЭТАЙ ВАЙНЕ, БАЮСЯ, НЕ БУДЗЕ ПЕРАМОЖЦЫ»

Аляксандр Лукашэнка таксама адзначыў, што негатыўную ролю цяпер адыгрывае Еўрасаюз. «Трэба спыніць гэту вайну. У гэтай вайне, баюся, не будзе пераможцы.

# І АДКРЫТЫ ДЫЯЛОГ ПЫТАННЯХ»

## саміце АДКБ

з тэрарызмам і наркатрафікам у нас, быццам бы, сістэма існуе», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Паводле слоў Прэзідэнта, ёсць шэраг выклікаў і пагроз як ваеннага, так і неваеннага характару, якія патрабуюць асаблівай увагі і рэагавання па лініі АДКБ ужо цяпер. «Гэта штучны інтэлект; беспілотныя лятальныя апараты і смяротныя аўтаномныя баявыя сістэмы, якія валодаюць алгарытмамі да саманавучання; кібертэрарызм; забеспячэнне бяспекі жыццёва важных аб'ектаў энергетычнай інфраструктуры, у першую чаргу АЭС і гідраэлектрастанцый; нарэшце, праблема закрыцця граніц для перамяшчэння тавараў і людзей. Гэтыя пытанні датычацца ўсіх дзяржаў — членаў АДКБ», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што развіваецца таксама супрацоўніцтва ў сферы кібербяспекі. Ён падзякаваў кыргызскаму боку за правядзенне канферэнцыі АДКБ па гэтай тэме. Вельмі важным Аляксандр Лукашэнка лічыць пачатак работы па далейшым удасканаленні канцэптуальных дакументаў арганізацыі. «Спадзяёмся, што яна атрымае свой працяг у найбліжэйшай перспектыве», — сказаў ён.

### «ПЭЎНЫМ СІЛАМ У ЕЎРОПЕ ТРЭБА АДМОВІЦЦА АД КАНФРАНТАЦЫІ»

Кіраўнік дзяржавы на саміце АДКБ заявіў аб падтрымцы намаганняў Расіі ў рэагаванні на прапанову ЗША па міры ва Украіне. «Што датычыцца Беларусі, дык я бачу і сёння па рэакцыі ўсіх членаў АДКБ, мы падтрымліваем намаганні Уладзіміра Пуціна, Расійскай Федэрацыі ў рэагаванні на прапанову ЗША па міры і мірным дагаворы ва Украіне. Вельмі спадзяёмся, што гэта адбудзецца. Натуральна, пэўным, як мы гэта бачым, сілам у Еўропе трэба адмовіцца ад канфрантацыі», — заявіў беларускі лідар.

«Але не разумею, як яны ад яе адмовяцца, калі яны трацяць такія велізарныя грошы на ўзбраенне і пераўзбраенне. Працэс запушчаны. Але, думаю, і ЗША, і Расія змогуць спыніць гэты працэс, дамовіўшыся з украінцамі па мірным дагаворы», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

**«Яшчэ раз падкрэсліваю: мы падтрымліваем вашы (Расіі. — «Зв.») намаганні па мірным дагаворы з Украінай. Я ўчора сказаў: калі амерыканцы сябе павядуць як дыпламаты і сапраўдныя юрысты, гэты дагавор будзе ўзгоднены. Паколькі ўжо асноўныя моманты ўзгоднены», — заявіў беларускі лідар.**

«Цяпер, як у нас кажуць, мяч на ўкраінскім баку. І думаю, што ў сувязі з тымі падзеямі, якія развіваюцца на фронце, Украіна пойдзе на гэты мірны дагавор. У адваротным выпадку страціць краіну цалкам», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

*На саміце АДКБ была прынята выніковая дэкларацыя Савета калектыўнай бяспекі. У ёй кіраўнікі дзяржаў у чарговы раз падкрэслілі прыхільнасць прынцыпам арганізацыі і гатоўнасць прыкладаць усе намаганні для таго, каб умацоўваць калектыўныя меры па забеспячэнні бяспекі ў АДКБ.*

*Наступны саміт АДКБ пройдзе 11 лістапада 2026 года ў Маскве. Старшынстваваць у арганізацыі будзе Расія.*

*31 студзеня наступнага з года пасаду генеральнага сакратара АДКБ зойме прадстаўнік Кыргызстана Таалатбек Масадыкаў.*

### ГАВОРАЦЬ УДЗЕЛЬНІКІ

**Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін:**



«З улікам геапалітычнай напружанасці цалкам лагічна, што на першы план выходзіць задача прасоўвання калектыўных інтарэсаў і ініцыятыў краін АДКБ на сусветнай арэне. Расія будзе і далей шчыльна ўзаемадзейнічаць з саюзнікамі па ўсіх пытаннях умацавання ваеннага патэнцыялу АДКБ. Асноўныя намаганні будуць сканцэнтраваны на павышэнні баяздольнасці нацыянальных кантынгентаў і ўдасканаленні кіравання калектыўнымі сіламі АДКБ. Адзін з найважнейшых прыярытэтаў АДКБ — інфармацыйная бяспека. Расія гатова цесна ўзаемадзейнічаць з саюзнікамі ў перашкодзе распаўсюджванню радыкальных ідэй у маладзёжным асяроддзі. Неабходна прыняць дадатковыя меры для абароны сумеснай інфармацыйнай прасторы ад такіх пагроз».

**Прэзідэнт Кыргызстана Садыр Жапараў:**



«На пасяджэнні ў вузкім фармаце мы прадуктыўна абмеркавалі шырокае кола пытанняў. Адбыўся адкрыты абмен думкамі па ключавых аспектах рэгіянальнай і глабальнай бяспекі. Па ўсіх пунктах сесіі было дасягнута паразуменне. Разам з тым зроблены канкрэтныя крокі па супрацьдзеянні сучасным выклікам і пагрозам бяспекі. Актыўна вялася работа па ўмацаванні міжнароднага аўтарытэту нашай арганізацыі і пашырэнні знешнепалітычнай каардынацыі. Былі рэалізаваны практычныя меры ў сферы ваенна-эканамічнага і ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва. У цэлым можна адзначыць, што запланаваныя мерапрыемствы арганізацыі на 2025 год выкананы паспяхова».

**Генеральны сакратар АДКБ Імангалі Тасмагамбетаў:**



«Ключавым вынікам саміту стала пацвярджэнне лідарамі дзяржаў-членаў прыхільнасці прынцыпам і мэтам АДКБ, а таксама прыняцце пакета дакументаў, накіраваных на ўмацаванне калектыўнай бяспекі. Асаблівая ўвага на пасяджэнні СКБ была ўдзелена абмеркаванню ваенна-палітычнага становішча ў зоне адказнасці АДКБ і гібрыдным пагрозам».

# РАШЭННЕ»

## пасля саміту

Гэта катастрофа. Ведаеце, чаму не будзе, калі раптам... Ну а калі будзе пераможца — гэта не Еўрапейскі саюз, калі ад іх адмовяцца ЗША», — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Вось так экспромтам я магу сказаць. Мы падумаем яшчэ над гэтымі пытаннямі. Наперадзе вялікая, цяжкая работа. Там шмат чаго: і Запарожская станцыя, і золатавалютныя рэзервы Расіі... Там усё ўлічана. Не без інтарэсаў ЗША. Штрых Трампа, як эканаміста, там прысутнічае. Не буду канкрэтызаваць».

Аляксандр Лукашэнка верыць, што канфлікт ва Украіне блізкі да заканчэння. «Як ніколі веру», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Разам з тым Прэзідэнт заўважыў: «Гэта вайна, і ў любы момант можа быць непрадбачаная сітуацыя, якая можа ў цэлым павярнуць абстаноўку назад. Вайна ёсць вайна — вельмі крытычны момант у жыцці любога грамадства і краіны, таму нельга расслабляцца. Трэба ўвесь час аднаму і другому боку быць у тэме».

Кіраўнік дзяржавы яшчэ раз нагадаў пра прапановы каманды прэзідэнта ЗША па мірным плане, якія ў асноўным прынятыя. «Я думаю, і еўрапейцы (Еўрасаюз. — **«Зв.»**) зразумеюць, што на гэта трэба ісці, і ўкраінцы. Ну, што артачыцца еўрапейцам? Прапанова — 600 тысяч — армія (ва Украіне. — **«Зв.»**). Еўрапейцы хочуць 800 тысяч. Ды Гасподзь з вамі! 600 тысяч – трэба ўтрымліваць армію. У палякаў сёння (яна мацнейшая эканамічна краіна) — 200 тысяч. 800 тысяч! Вы ўяўляеце, у велізарнай Расіі амаль такая армія!» — адзначыў беларускі лідар.

«Ну вось такія (у ЕС. — **«Зв.»**) — чапляюцца за што папала. Значыць, справа не ў змесце вось гэтага праекта мірнага дагавора з пункту гледжання еўрапейцаў. Яны не хочуць гэтага міру. Толькі не разумею, навошта ім вайна. Яны яе не выйграюць. Кажуць, англічане там не вельмі прыстойную ролю адыгрываюць і занялі пазіцыю. Думаю, паразумеюць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

*(Заканчэнне на 4-й стар.)*




Фота БелТА.

### ВЯЛІКАЯ КАМАНДЗІРОЎКА ПРАЦЯГВАЕЦЦА

Адразу пасля саміту АДКБ Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваўся з афіцыйным візітам у Рэспубліку Саюз М'янма. Учора позна ўвечары ён прыбыў у сталіцу М'янмы — горад Нейп'іdo.

Афіцыйныя перагаворы пройдуць сёння ў вузкім, а затым у пашыраным саставах.

Кіраўнік беларускай дзяржавы і выконваючы абавязкі Прэзідэнта Рэспублікі Саюз М'янма, старшыня Камісіі нацыянальнай бяспекі і міру Мін Аун Хлайн абмяркуюць перспектыўныя кірункі двухбаковага ўзаемадзеяння і рэалізацыю сумесных праектаў. Размова ў тым ліку пойдзе аб развіцці супрацоўніцтва ў галіне сельскай гаспадаркі і забеспячэння харчовай бяспекі, прамысловасці, фармацэўтыкі.

У перагаворным парадку дня таксама салідны блок пытанняў у сферы гуманітарнага супрацоўніцтва.

Будзе дадзена ацэнка ходу рэалізацыі дамоўленасцяў, дасягнутых у час перагавораў на вышэйшым узроўні ў Мінску ў сакавіку і чэрвені бягучага года.

Запланавана падпісанне шэрагу двухбаковых дакументаў, галоўны з якіх — дарожная карта па развіцці супрацоўніцтва паміж Беларуссю і М'янмай на 2026—2028 гады.

*Падрабязнасці — у наступным нумары.*

# «ТРЭБА ПРЫНЯЦЬ УЗВАЖАНАЕ РАШЭННЕ»

## САМАЕ НАРМАЛЬНАЕ ПЫТАННЕ — ВЯРНУЦЦА АБО ПРАЦЯГНУЦЬ ПЕРАГАВОРЫ 2015 ГОДА

Адказваючы на пытанне, ці гатовы ён стаць пасрэднікам у мірным урэгуляванні, Прэзідэнт Беларусі сказаў: «Я не люблю ніякага пасрэдніцтва. Які я буду пасрэднік? Мы ж «агрэсары» з Уладзімірам Уладзіміравічам, — іранічна заўважыў Прэзідэнт. — Вы ж чуеце: усе згодныя весці перагаворы ў Беларусі, супрацоўнічаць з Беларуссю. Акрамя Валодзі Зяленскага. Я ў чым яму насаліў? Таму я не імкнуся да гэтага».

«Я ўчора сказаў: калі гэта трэба (а гэта самы аптымальны момант і для таго, каб выправіць тое, што было тады — Нармандская гэта чацвёрка, калі еўрапейцы прыязджалі без ЗША), самае нармальнае пытанне — вярнуцца або працягнуць перагаворы, якія былі праведзеныя ў 2015 годзе. Калі так — калі ласка», — дадаў беларускі лідар.

**Дарэчы, пра тое, што без ЗША канфлікт ва Украіне не вырашыць, пра неабходнасць далучэння амерыканцаў да перагавораў па Украіне Прэзідэнт Беларусі гаварыў яшчэ ў 2015 годзе, калі Мінск прымаў «нармандскі фармат». Ужо пасля сустрэчы лідараў Расіі, Украіны, Германіі і Францыі ў нашай сталіцы ў інтэрв'ю амерыканскаму медыяхолдынгу «Блумберг» беларускі лідар дакладна адзначыў:**

**«Больш за ўсё мяне насцярожвае ў гэтым кірунку тое, што да Мінскіх пагадненняў, да гэтага працэсу адкрыта не былі падключаны Злучаныя Штаты Амерыкі. Я лічу, што без амерыканцаў ва Украіне немагчымая ніякая стабільнасць... Калі амерыканцы хочуць, каб тут былі мір і стабільнасць, яны неадкладна павінны падключыцца да гэтага працэсу... Я сказаў бы так: Злучаныя Штаты Амерыкі адыгрываюць вырашальную ролю ў гэтым працэсе і з пункту гледжання ўнутрыпалітычных працэсаў у самой Украіне, і з пункту гледжання не «супакойвання» Расіі, а з пункту гледжання, каб сесці за стол і дамовіцца з Расіяй па Украіне. Гэта вельмі важна».**

## «У НАС ВЕЛЬМІ БЛІЗКІЯ, ДОБРЫЯ АДНОСІНЫ З КЫРГЫЗСТАНАМ»

Адказваючы на пытанні журналістаў, і ў тым ліку прадстаўнікоў СМІ Кыргызстана, Аляксандр Лукашэнка сказаў, што паміж Беларуссю і Кыргызстанам выдатныя адносіны. «Самае галоўнае — мы захавалі ўсё тое, што было паміж намі ў савецкія часы. Памятаеце, мы ў вас нават куплялі насенне буракоў, таму што ў нас не маглі яго атрымаць. Надвор'е не тое. Мы нават гэта захавалі, не кажучы пра пастаўкі сюды нашай тэхнікі і гэтак далей. Апошнія год-два вы сталі багацейшымі, значна. Я заўважыў, вы шмат чаго будуеце. Малайцы! Па вядомых прычынах. Мы з расіянамі пад санкцыі патрапілі. У Кыргызстане малайцы. Яны гэтым скарысталіся і правільна зрабілі», — сказаў Прэзідэнт.

«Другі момант, каб вы разумелі пра нашы адносіны: калі ўкраінцы пачалі разбураць інфраструктурныя аб'екты на тэрыторыі Расіі, перш за ўсё нафтаперапрацоўчыя, у вас знікла паліва. Вядома, мы па сваіх абавязацельствах расіянам шмат чаго пастаўляем, магутныя два заводы (НПЗ, якія працуюць у Беларусі. — **«Зв.»**), але кіргізы папрасілі дапамагчы: «Няма паліва!» Мы адгукнуліся, дамовіліся з Уладзімірам Уладзіміравічам, адарвалі кавалачак ад расіян і супрацоўнічаем з вамі. У нас вельмі блізкія, добрыя адносіны», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт таксама расказаў пра жыццё ў Беларусі экс-прэзідэнта Кыргызстана Курманбека Бакіева: «Бакіеў таксама добра жыве. Нармальна. Мы яго да вас не адпусцім ўжо. Я яму сказаў: «Ніякіх паездак, хопіць! Жыві ў Беларусі». Нармальна жыве. Я часам бываю ў яго ў гасцях, калі запрашае. Так што мы яго вам не аддадзім».

«Але ён вельмі пакутуе і сумуе па краіне. Усё мне кажа: вось хацеў бы хоць на магілу прыехаць да бацькі. Ну, гэта не справа, што кіргізы не могуць дазволіць свайму прэзідэнту прыехаць на магілу бацькі. Думаю, мы вырашым гэта пытанне з цяперашнім кіраўніцтвам», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

**Паводле прэс-службы Прэзідэнта.**

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

# ВЫСОКАТЭХНАЛАГІЧНАЯ І ПРЫБЫТКОВАЯ СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА

## Намеснік Прэм'ер-міністра Юрый ШУЛЕЙКА — аб выніках работы і перспектывах развіцця АПК

На сумесным пасяджэнні Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі віцэ-прэм'ер расказаў аб павышэнні канкурэнтаздольнасці і кірунках развіцця аграпрамысловага комплексу краіны, пасля чаго адказаў на пытанні парламентарыяў.

### НЕ МЕНШ ЧЫМ 11 МІЛЬЁНАЎ ТОН ЗБОЖЖА І 240 ТЫСЯЧ ТОН ЯБЛЫКАЎ



Па кожным кірунку сельскагаспадарчай і прамысловай вытворчасці ў сферы АПК адпрацавана стратэгія і тактыка эфектыўнай дзейнасці. «У раслінаводстве сістэмна падышлі да валавой вытворчасці збожжа на ўзроўні 11 мільёнаў тон збожжа і захаванні такіх аб'ёмаў вытворчасці штогод, — канкрэтызаваў Юрый Шулейка. — Для гэтага сумесна з вучонымі сфарміравана і даведзена да выканання аблывканкамаў аптымальная структура пасяўных плошчаў збожжавых, зернебабовых, крыжакветных культур. У апошнія гады істотна пашыраны рэестр айчыннага насення, якое па якасных характарыстыках не саступае імпарту».

Што датычыцца забеспячэння насельніцтва сваімі садавінай і агароднінай, рэалізоўваецца Стратэгія развіцця цяплічнага агароднідства на 2023—2027. «Вырашана задача па вытворчасці агуркоў у міжсезонны перыяд пад поўную патрэбнасць унутранага рынку, — праінфармаваў віцэ-прэм'ер. — У міжсезонны перыяд 2024/2025 гадоў выпушчана 14,3 тысячы тон агуркоў, або 172 % ад патрэбы. Для нарошчвання аб'ёмаў вытворчасці таматаў і зялёных культур у міжсезонны перыяд вызначаны цяплічныя гаспадаркі, дзе будзе ажыццяўляцца рэалізацыя гэтых праектаў. Па выніках уводу намечаных да рэалізацыі праектаў патрэба краіны ў таматах у міжсезонны перыяд 2027/2028 гадоў будзе забяспечана на 118 %, мы пакладзём на прылавак каля 20 тысяч тон».

У 2030 годзе аб'ёмы вытворчасці садавіны і ягад плануецца павялічыць да 265 тысяч тон, у тым ліку 240 тысяч тон яблыкаў, што дасць магчымасць забяспечыць унутраныя патрэбы краіны ў поўным аб'ёме і мець свабодныя рэсурсы для рэалізацыі на экспарт.

### БУДЗЕМ З МАЛАКОМ І МЯСАМ

Гэты год шмат у чым з'яўляецца знакавым для жывёлагадоўлі. Па словах Юрыя Шулейкі, упершыню за гісторыю суверэннай Беларусі ў бягучым годзе будзе атрымана больш як 9 мільёнаў тон малака пры сярэднім удоі ад каровы — 6500 кілаграмаў. У краіне функцыянуе каля 1700 малочнатаварных комплексаў, аснашчаных сучаснымі тэхналогіямі ўтрымання, на якіх размешчана больш як 75 % дойнага статка і вырабляецца больш як 80 % малака. Да канца года плануецца ўвесці (рэканструяваць) каля 80 МТК. Па словах віцэ-прэм'ера, тэндэнцыя захаваецца: да канца 2030 года плануецца пабудаваць (рэканструяваць) каля 300 малочнатаварных комплексаў.

Разам з будаўніцтвам МТК, адкормачнікаў БРЖ пачата маштабная работа па развіцці ўльтрасучаснай свінагадоўлі. Па словах Юрыя Шулейкі, па выніках 2030 года вытворчасць свініны ў сельскагаспадарчых арганізацыях у забойнай вазе складзе каля 400 тысяч тон, што поўнасцю забяспечыць патрэбы ўнутранага рынку (уключаючы мясаперапрацоўку) у айчыннай свініне.

Забяспечваецца дынамічнае развіццё і птушкагадоўлі, будуюцца новыя рыбакомплексы.

Што датычыцца перапрацоўкі, у малочнай прамысловасці за пяцігодку ўдалося забяспечыць прырост вытворчасці па ўсёй наменклатуры прадукцыі. «Асноўны пакупнік малочнай прадукцыі — Расійская Федэрацыя — імкліва развівае сваю вытворчасць, таму арыентуемся на дыверсіфікацыю экспарту ў далёкія краіны», — адзначыў віцэ-прэм'ер.

«На працягу апошніх 5 гадоў у нашай краіне назіраецца ўстойлівая тэндэнцыя да росту вытворчасці гатовых мясных вырабаў, — канстатаваў намеснік кіраўніка ўрада. — З 2020-га да 2024 года ў Беларусі забяспечаны тэмп росту вытворчасці каўбасных вырабаў — 117,6 %, гатовых і кансерваваных вырабаў з мяса — 132,1 %». Да 2030 года мясакамбінатамі запланавана тэхнічнае пераасняшчэнне і мадэрнізацыя дзеючых магутнасцяў па забоі, першаснай перапрацоўцы жывёлы, вытворчасці гатовай прадукцыі.

У кансервавай галіне плануецца рэалізаваць шэраг імпартазамяшчальных праектаў па выпуску такіх пазіцый, як агуркі кансерваваныя і марынаваныя, кансервы з грыбамі, сокавая прадукцыя, таматныя соусы, кетчупы. Па словах віцэ-прэм'ера, найважнейшым кірункам у айчынным кансерваванні з'яўляецца вытворчасць плодаагароднінная харчавання для дзяцей ранняга ўзросту.

### КАДРЫ, «ЛІЧБАВАЯ СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА» І «ДАКЛАДНАЕ ЗЕМЛЯРОБСТВА»

Асобным блокам прагучала пытанне рэалізацыі кадравай палітыкі ў сельскай гаспадарцы, што з'яўляецца неад'емнай умовай стабільнага развіцця аграрнай галіны. Для зніжэння адтоку кваліфікаваных работнікаў з галіны, павышэння замацавання маладых спецыялістаў на вытворчасці ў кастрычніку бягучага года прыняты ўказ Прэзідэнта, у адпаведнасці з якім павялічаны ў два разы стымуляцыйныя выплаты маладым спецыялістам да 273 рублёў на працягу першых двух гадоў і да 410 рублёў у наступныя тры гады.

Максімальна ўкамплектаваны ў бягучым годзе вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы аграрнага профілю. Па выніках уступнай кампаніі ў аграрныя ВНУ на дзённую форму навучання залічана 1927 студэнтаў, у каледжы — 3106 навучэнцаў.

Кажучы аб перспектывах на бягучую пяцігодку, Юрый Шулейка адзначыў, што адным з ключавых кірункаў развіцця АПК стане забеспячэнне паўсюднага пераходу сельскагаспадарчай галіны на высокатэхналагічны, больш эфектыўны ўзровень развіцця. «Будзе прадоўжана укараненне прынцыпаў «лічбавай сельскай гаспадаркі» з маштабаваннем тэхналогіі «дакладнага земляробства», — канкрэтызаваў ён. — Плануецца прыняць сістэмныя меры па зніжэнні залежнасці галіны ад імпартных паставак. Выключаем пасрэдніцтва на ўсіх узроўнях шляхам цэнтралізацыі закупак».

«Да канца пяцігодкі чакаем рост аддачы ад АПК у 1,6 раза і павелічэнне экспарту прадуктаў харчавання па выніках 2030 года да 12 мільярдаў долараў, — падагульніў віцэ-прэм'ер. — Аграпрамысловы комплекс будзе забяспечваць далейшае паступальнае развіццё і выконваць пастаўленыя перад ім задачы».

**Вераніка КАНЮТА.**

# ЧЛЕНЫ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ ПРЫНЯЛІ ШЭРАГ ЗАКОНАПРАЕКТАЎ

Сярод іх — «Аб бюджэце дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь на 2026 год», «Аб змяненні законаў па пытаннях натарыяльнай дзейнасці», «Аб змяненні законаў па пытаннях забеспячэння ваеннай бяспекі і абароны».

Акрамя таго, сенатары ратыфікавалі Дагавор паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй аб фарміраванні аб'яднанага рынку электрычнай энергіі Саюзнай дзяржавы, Пагадненне паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Ісламскай Рэспублікі Пакістан аб рэадмісіі, Пагадненне паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў аб гандлі паслугамі і ажыццяўленні інвестыцый.

Ратыфікаваны Чацвёрты дадатковы пратакол да Агульнага рэгламенту Сусветнага паштовага саюза, Першы дадатковы пратакол да Сусветнай паштовай канвенцыі, Першы дадатковы пратакол да Пагаднення аб паштовых плацежных паслугах.

Раман Бродаў, прызначаны ўказам Прэзідэнта членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь восьмага склікання, аднагалосна выбраны старшынёй Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах.

Акрамя таго, члены Савета Рэспублікі прынялі заяву аб неабходнасці спынення эканамічнай, гандлёвай і фінансавай блакады, якая ажыццяўляецца супраць Рэспублікі Куба.

**Паводле прэс-службы Савета Рэспублікі.**

БЕЛАРУСЬ БУДУЧЫНІ

# «КОМПЛЕКСНЫ І ПРАПРАЦАВАНЫ ПОГЛЯД НА БУДУЧЫНЮ КРАІНЫ»




## Працягваецца абмеркаванне праекта Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2026—2030 гады

Учора абмеркаванні адбыліся ў Палаце прадстаўнікоў, Канстытуцыйным і Вярхоўным судах (дэпутаты і суддзі, паводле Канстытуцыі, з'яўляюцца дэлегатамі УНС), а таксама на абласных сходах дэлегатаў VII УНС ад Гродзеншчыны і Віцебшчыны. Задача актыўна падключаць дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу да гэтага працэсу ставілася Старшынёй УНС Аляксандрам Лукашэнкам. Упершыню такая пільная ўвага да маючага адбыцца Сходу, што, несумненна, абумоўлена як фарматам, так і зместам галоўнага грамадска-палітычнага мерапрыемства года. Першы раз у гісторыі суверэннай Беларусі на зацвярджэнне дэлегатаў УНС, а значыць, усяго народа, выносіцца найважнейшы дакумент, які вызначыць стратэгію развіцця краіны на найбліжэйшыя пяць гадоў.

У Палаце прадстаўнікоў, Канстытуцыйным і Вярхоўным судах праект Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на 2026—2030 гады прадставіў міністр эканомікі Юрый Чабатар. Прыярытэты развіцця краіны на будучую пяцігодку дэлегатам УНС ад Гродзенскай вобласці давялі намеснік міністра эканомікі Марыя Мажынская, дэлегатам УНС ад Віцебскай вобласці — намеснік міністра эканомікі Алена Балігатава.

Нашы карэспандэнты працавалі на месцах і пацікавіліся меркаваннямі дэлегатаў аб праграме жыцця краіны на наступныя пяць гадоў.

**Дэлегат УНС, намеснік Старшыні Палаты прадстаўнікоў Вадзім ІПАТАЎ:**



— Дэпутаты і раней падключаліся да прапрацоўкі пытанняў Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на 2026—2030 гады, былі ўнесены адпаведныя прапановы. Усенароднае абмеркаванне гэтага найважнейшага дакумента ўяўляе яркі прыклад дэмакратыі. Прымаючы такія стратэгічныя дакументы, як Праграма сацэканамразвіцця, Усебеларускі народны сход падкрэслівае сваю ролю ў кансалідацыі, забеспячэнні адзінства ў грамадстве, суверэнітэту і незалежнасці нашай краіны. Вызначаныя ў праграме сем прыярытэтаў накіраваны на гарантаванне дабрабыту нашых грамадзян, стабільнасць у краіне, паступальнае эканамічнае развіццё. Дэмаграфічную бяспеку, развіццё чалавечага патэнцыялу немагчыма забяспечыць без адпаведных выдаткаў на тую ці іншую сферу.

**Дэлегат УНС, першы намеснік Старшыні Вярхоўнага суда Валерый КАЛІНКОВІЧ:**

— Праект Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2026—2030 гады ўяўляе сабой комплексны і добра прапрацаваны погляд на будучыню нашай краіны па ўсіх асноўных кірунках яе развіцця, становішча спраў у нашым грамадстве, захаванне тых сацыяльных гарантый, якія прадугледжвае сацыяльна-арыентаваная прававая дзяржава, якой з'яўляецца Рэспубліка Беларусь. Асноўныя палажэнні дакумента дэлегатамі вывучаны, яны зразумелыя і ўспрымаюцца як правільныя. У судовай кампетэнцыі вельмі шмат пытанняў, якія неабходна вырашаць для таго, каб у грамадстве быў мір і спакой, эканоміка працавала стабільна, а дзейнасць судоў умацоўвала давер насельніцтва да інстытутаў улады, у тым ліку судовай.



**Дэлегат УНС, старшыня Лідскага раённага Савета дэпутатаў Інеса БЕЛУШ:**



— У грамадстве ўжо сфарміравалася разуменне важнасці рашэнняў, якія прымаюцца Усебеларускім народным сходам. Мы, дэлегаты, з пачуццём адказнасці будзем прымаць Праграму сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі да 2030 года. Яна распрацавана дасведчанымі людзьмі: упраўленцамі, экспертамі, прадстаўнікамі грамадзянскай супольнасці, але і мы зможам выказаць сваю думку і прапановы. Запыт насельніцтва, які неабходна пакласці ў стратэгію работы на перспектыву, — захаваць сацыяльную мадэль развіцця дзяржавы, забяспечыць дабрабыт, роўныя магчымасці для развіцця кожнага рэгіёна. Прынцыпы праграмы з улікам новых стандартаў якасці жыцця, арыентацыі на развіццё чалавечага патэнцыялу, захавання роўных магчымасцяў забяспечыць не толькі ўстойлівасць, але і росквіт беларускай дзяржавы.

**Дэлегат УНС, ляснічы Параф'янаўскага лясніцтва Бягомльскага лясгаса Андрэй ЗАІКА:**



— І сям'я, і асобнае прадпрыемства, і раён, і дзяржава ў цэлым павінны развівацца ў адпаведнасці з пэўным планам. Мы ж на бытавым узроўні плануем, якую адукацыю хочам даць дзецям, будзем узводзіць новы дом ці застанёмся ў невялікай кватэры, што будзем рабіць, каб зарабіць больш грошай. Так і ў краіне: трэба вызначаць прыярытэты, імкнуцца да павышэння ўзроўню жыцця народа, шукаць крыніцы папаўнення бюджэту. Звычайным людзям трэба, каб быў мір і спакой, стабільная работа, годны заробак, каб пасля работы можна было спакойна адпачыць. Гэта і ёсць якасць жыцця, на паляпшэнне якога і накіравана праграма сацэканамразвіцця краіны на наступную пяцігодку. Дакумент датычыцца ўсіх. І каб усё ажыццявілася, патрэбны намаганні кожнага беларуса.

**Дэлегат УНС, студэнтка ГрДУ імя Янкі Купалы Анастасія КІСЕЛЬ:**



— Распрацоўка Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця на найбліжэйшыя пяць гадоў — цэнтральная падзея, якая вызначае вектары развіцця Беларусі. Мяне, як студэнта і прадстаўніка СМІ, найбольш цікавяць пытанні падтрымкі моладзі і маладых сем'яў, пытанні адукацыі і развіцця медыясферы. У праграме ўсё накіравана на людзей, паляпшэнне іх якасці жыцця. Улічваюцца патрэбы ўсіх катэгорый насельніцтва, у тым ліку моладзі. Прэзідэнт адзначаў, што кожны малады чалавек у сучасным свеце непазбежна сутыкаецца з палітыкай, бо яна праходзіць праз усе аспекты нашага жыцця. Для грамадзян Беларусі вельмі важна быць у курсе падзей, якія адбываюцца ў краіне. Ініцыятыўнай моладзі ўсё больш, і мы разам смела крочым у новую пяцігодку.



Фота БелТА.

**Дэлегат УНС, старшыня Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях Палаты прадстаўнікоў Ірына КАСЦЕВІЧ:**



— Ключавая мэта праграмы — пераход на новы, якасны ўзровень жыцця кожнага беларуса. У цэнтры ўвагі — чалавек. Адразу кідаецца ў вочы, што на першым месцы ў праекце праграмы — дэмаграфічная бяспека, другім прыярытэтам з'яўляецца развіццё чалавечага патэнцыялу. Забеспячэнне стабільнасці колькаснасці насельніцтва і рост нараджальнасці датычыцца кожнага з нас. Ёсць працоўныя рэсурсы — ёсць развіццё эканомікі. Адпаведна, ёсць падаткі, якія паступаюць у бюджэт, — значыць, ёсць развіццё краіны ў цэлым. Індыкатары, вызначаныя ў праграме, накіраваны на вырашэнне гэтай звышскладанай, найважнейшай задачы. Для развіцця краіны неабходны здаровая нацыя і высокакваліфікаваныя кадры, таму ў адным звязку і адукацыя, і ахова здароўя. Акцэнт зроблены на адказнасці кожнага беларуса за сваё здароўе, на адукацыю праз усё жыццё. Усё гэта адпавядае выклікам часу.

**Дэлегат УНС, старшыня Новалукомльскага гарадскога Савета дэпутатаў Алена МАЛЯРОВА:**



— Бачу пададбенства ў праектах праграмы і плане развіцця роднага горада. Рэалізацыя сацыяльна значных праектаў напрамую залежыць ад стану эканомікі рэгіёна. У Новалукомлі стаў актыўней развівацца бізнес. Так, у рамках рэалізацыі праграмы "Адзін раён — адзін праект" адкрыўся кансервавы завод. Цяпер тут перапрацоўваюць рыбу, плануюць увесці лінію па перапрацоўцы мяса птушкі. Разглядаецца пытанне аб мадэрнізацыі горадаўтваральнага прадпрыемства, Лукомльскай ГРЭС. Стабільная эканоміка дазволіць будаваць і рамантаваць дамы, добраўпарадкаваць гарадскія тэрыторыі. Чалавек жыве не хлебам адзіным: у наступнай пяцігодцы гараджане плануюць аказаць дапамогу пры ўзвядзенні праваслаўнай царквы. Мы хочам развівацца разам з усёй краінай.

**Дэлегат УНС ад судзейскага корпуса, суддзя Канстытуцыйнага суда Ала БОДАК:**



— Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця накіравана на рэалізацыю тых сацыяльных гарантый і абавязацельстваў, якія ўсклала на сябе дзяржава ў выніку рэспубліканскага рэферэндуму, праведзенага 27 лютага 2022 года. Тры з сямі прыярытэтаў датычацца сацыяльнага складніка нашай дзяржавы. Гэта сведчыць аб тым, што прынцып сацыяльнай дзяржавы атрымаў сваё рэальнае ўвасабленне. Сярод ключавых прыярытэтаў праграмы — павышэнне якасці жыцця людзей. Для вырашэння тых задач, якія пастаўлены, патрэбны высокакваліфікаваныя кадры, здольныя вырашыць задачы па фарміраванні інтэлектуальнай эканомікі. Адзін з такіх кірункаў — практыка-арыентаваная адукацыя. Нам патрэбны высокакваліфікаваныя спецыялісты, якія могуць забяспечыць лічбавую трансфармацыю грамадства і эканомікі.

**Дэлегат УНС, начальнік аддзела ідэалагічнай работы і па справах моладзі Мастоўскага райвыканкама Тацціяна ПРАКАПЕНЯ:**



— Пытанні сацыяльна-эканамічнага характару (такія як годны ўзровень аплаты працы, забеспячэнне сацыяльных гарантый) асабліва актуальныя для маладых спецыялістаў. Важна, каб моладзь заставалася ў малых гарадах і сельскай мясцовасці. Увага да гэтых пытанняў мае крытычнае значэнне для будучыні краіны. Неабходна стварыць умовы, у якіх маладыя спецыялісты змогуць рэалізаваць свой патэнцыял, унесці свой уклад у развіццё рэгіёнаў. Ад моладзі залежыць будучыня Беларусі. Таму важна ўдзяляць асаблівую ўвагу распрацоўцы і рэалізацыі мер, накіраваных на падтрымку маладых спецыялістаў, паляпшэнне якасці жыцця ў малых гарадах і сельскай мясцовасці. Гэта залог росквіту нашай краіны, забеспячэння яе ўстойлівага развіцця.

**Вераніка КАНЮТА, Вераніка КАЗЛОЎСКАЯ, Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ, Святлана ЯКАЎЛЕВА.**

**ООО «Деловая оценка»** (Организатор аукциона) по поручению **Речицкого РайПО** (Продавец) извещает о проведении **10 декабря 2025 года** открытого повторного аукциона по продаже имущества в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

| |
|---|
| **Лот № 2:** Капитальное строение с инв. № 340/С-3204616 площадью 128,8 кв. м, назначение – Здание специализированное розничной торговли, наименование – Здание магазина, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 324584404101000013 площадью 0,0303 га по адресу: Гомельская обл., Речицкий р-н, Защёбьевский с/с, д. Макановичи, ул. Школьная, 101. Составные части и принадлежности: кирпичная пристройка |
| **Начальная цена** продажи с НДС – 165,6 бел. руб. **Задаток** – 1,66 бел. руб. |
| **Лот № 3:** Капитальное строение с инв. № 340/С-3204621 площадью 88,9 кв. м, назначение – Здание специализированное розничной торговли, наименование – Здание магазина № 37, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 324585406601000007 площадью 0,0471 га по адресу: Гомельская обл., Речицкий р-н, Короватичский с/с, д. Тишковка, ул. Советская, 6. Составные части и принадлежности: пристройка из блоков газосиликатных |
| **Начальная цена** продажи с НДС – 150,00 бел. руб. **Задаток** – 1,50 бел. руб. |

**Продавец: Речицкое РайПО**, г. Речица, ул. Привокзальная, д. 2. Конт. тел.: +375 232 34-98-92, +375 33 643-43-14.

**Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона ООО «Деловая оценка»: BY60BELB30121322650030226000 в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, пр-т Ленина, 10, БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**

**2.** Подать заявление Организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и с **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 09.12.2025 г. в 17.00.**

Порядок участия и проведения аукциона с перечнем необходимых документов опубликован на сайте www.deloocenka.by.

**Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения.** Единственный участник имеет право приобрести лот с шагом 5 %. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; стоимость, сформированная в результате аукциона, должна быть выплачена Продавцу в течение **30 (тридцати) календарных дней** с момента проведения торгов. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости предмета оценки. Указанные объекты никому другому не проданы, не заложены, под запретом не состоят, судебного спора о них не имеется, других владельцев нет. Проводится аукцион в соответствии с Положением общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

**Конт. тел. организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62**

**ООО «Деловая оценка»** (Организатор аукциона) по поручению **Речицкого РайПО** (Продавец) извещает о проведении **10 декабря 2025 года** повторного открытого аукциона по продаже имущества в 12.00 по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

| |
|---|
| **Лот № 1:** Капитальное строение с инв. № 340/С-3204617 площадью 261,8 кв. м, назначение – Здание специализированное розничной торговли, наименование – Здание магазина, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 324584402101000007 площадью 0,1030 га по адресу: Гомельская обл., Речицкий р-н, Защёбьевский с/с, д. Глинная Слобода, ул. Центральная, 92. Лот включает оборудование в количестве 20 ед. Перечень опубликован на сайте www.deloocenka.by |
| **Начальная цена** продажи с НДС – 14 483,70 бел. руб. **Задаток** – 144,84 бел. руб. |

**Продавец: Речицкое РайПО**, г. Речица, ул. Привокзальная, д. 2. Конт. тел.: +375 232 34-98-92, +375 33 643-43-14.

**Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона ООО «Деловая оценка»: BY60BELB30121322650030226000 в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, пр-т Ленина, 10, БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**

**2.** Подать заявление Организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и с **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 09.12.2025 г. в 17.00.**

Порядок участия и проведения аукциона с перечнем необходимых документов опубликован на сайте **www.deloocenka.by.**

**Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения.** Единственный участник имеет право приобрести лот с шагом 5 %. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** с момента подписания протокола; стоимость, сформированная в результате аукциона, должна быть выплачена Продавцу в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента проведения торгов. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости предмета оценки. Указанные объекты никому другому не проданы, не заложены, под запретом не состоят, судебного спора о них не имеется, других владельцев нет. Проводится аукцион в соответствии с Положением общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

**Конт. тел. организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62**

МЕДЫЯПРАСТОРА

# «МЫ ПРАЦУЕМУ ІНТАРЭСАХ НАШАЙ ДЗЯРЖАВЫ,

## Учора прайшоў XV юбілейны з'езд Беларускага саюза журналістаў

**У Мінску завяршылася галоўная медыйная падзея пяцігодкі — майстры пяра з усёй краіны сабраліся, каб абмеркаваць, як заставацца пачутымі ў эпоху лічбавага шуму, штучнага інтэлекту і іншых асаблівасцей сучаснасці.**

### ПРАЎДА — ПРЫЯРЫТЭТ БЕЛАРУСКАЙ ЖУРНАЛІСТЫКІ



**Першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Уладзімір ПЯРЦОЎ** зачытаў удзельнікам з'езда прывітальны адрас ад Прэзідэнта. У ім адзначаецца, што гэты форум аб'яднаў найлепшых прадстаўнікоў журналісцкай супольнасці краіны, тых, чые талент і цвёрдая грамадзянская пазіцыя дапамагаюць адстойваць нацыянальныя інтарэсы і захоўваць духоўныя каштоўнасці народа на перадавой барацьбы за розумы і сэрцы людзей.

— Журналісты з аб'ектыўным поглядам, уменнем аналізаваць і работай на апярэджанне штодзень фарміруюць рэальную карціну свету і дапамагаюць арыентавацца ў інфармацыйных патоках, — гаворыцца ў прывітанні. — Падтрымліваючы традыцыйныя і развіваючы новыя фарматы, вы робіце ўсё, каб беларусы ганарыліся сваёй Радзімай, а за яе межамі аб нашай краіне гаварылі толькі праўду.

Для ўсіх удзельнікаў з'езда зразумела: бліжэйшыя гады будуць няпростымі. Глабальная медыяпрастора даўно стала сапраўдным полем бітвы за праўду. Важнасць не паддавацца на правакацыі, не пераймаць невысокія стандарты заходніх медыя адзначыў Уладзімір Пярцоў. Гэтая думка стала лейтматывам усяго з'езда, бо ў сучасных рэаліях менавіта выразная грамадзянская пазіцыя — залог якаснай журналістыкі.

— Толькі тады, калі мы будзем дамініраваць у нашай інфармацыйнай прасторы, часам у цяжкай абстаноўцы ўтрымліваючы лідзіруючыя пазіцыі, толькі тады, калі мы не будзем адмахвацца ад драбнатэмнасці, на нашу думку, тады мы будзем карысныя і патрэбныя нашай галоўнай каштоўнасці — нашым чытачам, слухачам і гледачам, — падкрэсліў першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта .



Звяртаючыся да ўдзельнікаў форуму, **міністр інфармацыі Марат МАРКАЎ**, у сваю чаргу падкрэсліў, што Саюз журналістаў — галоўны партнёр ведамства ў развіцці айчыннай журналістыкі.

— Беларускі саюз журналістаў заўсёды быў і застаецца ключавым партнёрам Міністэрства інфармацыі ў справе захавання і развіцця айчыннай журналістыкі, павышэння прафесійнага ўзроўню нашых кадраў і ўмацавання адзінства інфармацыйнай прасторы краіны, — падкрэсліў ён.

Таксама міністр інфармацыі акцэнтаваў увагу прысутных на важнай ролі саюза ў сучасных умовах, калі інфармацыйная сфера падвяргаецца беспрэцэдэнтнаму ціску, і абазначыў прыярытэтныя кірункі для далейшага развіцця арганізацыі.

Асобна Марат Маркаў падкрэсліў важнасць падтрымкі маладых кадраў, развіцця медыяпрасторы, умацавання міжнароднага дыялогу і экспертнай ролі БСЖ у фарміраванні дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі.

### ЧАС НОВЫХ МЕДЫЯ

Пяць гадоў таму, на XIV з'ездзе, медыя стаялі на парозе вялікіх перамен. Пандэмія, паскораная лічбавізацыя, трансфармацыя класічных СМІ — усё гэта патрабавала тэрміновых рашэнняў. Цяпер прысутнасць у сацыяльных сетках, інтэграцыя розных лічбавых платформаў і нават нейрасетак з дадатковага варыянту работы з аўдыторыяй ператварылася ў паўсядзённасць работніка медыйнай сферы.



Па словах **старшыні праўлення ГА «Беларускі саюз журналістаў», генеральнага дырэктара УП «Агенцтво «Мінск-Навіны» Андрэя КРЫВАШЭЕВА**, сённяшнія журналісты ўсё часцей ствараюць дынамічны кантэнт для сацсетак, застаючыся пры гэтым вядомымі аўтарамі ў сваіх, традыцыйных, СМІ. А ці ёсць, хто разбіраецца ў сучасных тэхналогіях лепш за маладое пакаленне? Таму на мерапрыемства былі запрошаны не толькі прызнаныя мэтры, але і будучыня прафесіі — студэнты факультэта журналістыкі.

Удзел у рабоце з'езда грамадскай арганізацыі, якая стаіць на варце прафесійных інтарэсаў і адстойвае правы журналістаў, у тым ліку свабоду слова, стане карысным вопытам для юнакоў і дзяўчат.

— Падобныя мерапрыемствы спрыяюць павышэнню цікавасці моладзі да нашай прафесіі, усведамленню важ-

БЯСПЕКА

# ПРАДСТАЎНІКІ ФІНАНСАВЫХ РАЗВЕДАК З 18 КРАІН САБРАЛІСЯ Ў МІНСКУ

**У Мінску праходзіць пленарны тыдзень Еўразійскай групы па процідзеянні адмыванню злачынных даходаў і фінансаванню тэрарызму (ЕАД). Удзел у мерапрыемствах бяруць дэлегацыі дзевяці краін — удзельніц ЕАД (Беларусь, Індыя, Казахстан, Кітай, Кыргызстан, Расія, Таджыкістан, Туркменістан і Узбекістан). Таксама ўдзельнічаюць дзяржавы і міжнародныя арганізацыі, якія маюць статус назіральніка. Беларусь у ЕАД прадстаўляе Дэпартамент фінансавага маніторынгу Камітэта дзяржкантролю.**

Больш за 300 прадстаўнікоў дзяржаўных і праваахоўных органаў, падраздзяленняў фінансавых разведак, экспертаў з 18 краін свету абмяркоўваюць пытанні ўзаемадзеяння ў сферы барацьбы з легалізацыяй злачынных даходаў. Як адзначыў на пленарным пасяджэнні ЕАД **старшыня Камітэта дзяржкантролю Беларусі Васіль ГЕРАСІМАЎ**, сёння ўвесь свет сутыкаецца з новай хваляй глабальных змяненняў, імклівым развіццём лічбавай эканомікі, з'яўленнем альтэрнатыўных форм грошай і разлікаў, а таксама пашырэннем міжнародных фінансавых інструментаў.



— Глабалізацыя сусветнай эканомікі прыводзіць да свабоднага руху фінансавых патокаў на ўзроўні дзяржаў, кампаній і прыватных асоб. У гэтых умовах сучасныя пагрозы становяцца ўсё больш складанымі і разнастайнымі. Сярод іх розныя віды развітага фінансавага махлярства і кіберзлачыннасці, незаконнае выкарыстанне крыптавалют, а таксама старанна арганізаваныя формы экстрэмізму, якія патрабуюць узгодненых падыходаў да іх выяўлення і папярэджання. Міжнародны вопыт паказвае, што эфектыўна супрацьстаяць такім выклікам магчыма толькі пры функцыянаванні ў кожнай дзяржаве добра прадуманай і зладжанай сістэмы кантролю, заснаванай на адзіных стандартах, а таксама выключна ў рамках цеснага супрацоўніцтва паміж краінамі, — сказаў Васіль Герасімаў.

Ён адзначыў, што Беларусь рыхтуецца да будучага працэсу ацэнкі ФАТФ (Група распрацоўкі фінансавых мер барацьбы з адмываннем грошай).

— Перш за ўсё працягваецца ўдасканаленне нацыянальнага антыадмывачнага заканадаўства, укараненне новых механізмаў, накіраваных на павышэнне эфектыўнасці фінансавых расследаванняў і аператыўнае выяўленне даходаў, атрыманых злачынным шляхам. Асаблівая ўвага ўдзяляецца рэгуляванню абароту лічбавых знакаў, вядуцца цэнтралізаваныя рэестры крыптакашалькоў, якія выкарыстоўваюцца для атрымання злачыннага даходу, наладжаны эфектыўны механізм арышту і канфіскацыі крыптавалюты, прыняты палажэнні аб падаткаабкладанні аперацый з лічбавымі актывамі і іншыя меры, якія забяспечваюць празрыстасць гэтай сферы, — адзначыў Васіль Герасімаў.



**Дырэктар Росфінманіторынгу, старшыня Еўразійскай групы па супрацьдзеянні легалізацыі злачынных даходаў і фінансаванню тэрарызму Юрый ЧЫХАНЧЫН** адзначыў, што нацыянальная

# НАШЫХ ЛЮДЗЕЙ».



насці і патрэбнасці такіх арганізацый, як Беларускі саюз журналістаў. Каля 100 студэнтаў і 20 выкладчыкаў нашага факультэта прысутнічаюць сёння тут, — зазначыў **дэкан факультэта журналістыкі БДУ Аляксей БЯЛЯЕЎ**.

Дарэчы, на юбілейным з'ездзе Беларускага саюза журналістаў была агучана ініцыятыва аб стварэнні Савета старэйшын — ветэранаў, сапраўдных майстроў слова. Плануецца, што яны будуць актыўна ўдзельнічаць у рабоце саюза: займацца настаўніцтвам, весці майстар-класы, выдаваць кнігі і выступаць на буйных форумах і семінарах — усё гэта дапаможа спецыялістам абменьвацца вопытам, набываць неабходныя кампетэнцыі і не адставаць ад імклівага тэмпу часу.

## НА ІНФАРМАЦЫЙНЫМ ФРОНЦЕ

Адначасова з'езд востра паставіў пытанне аб праблемах сучаснасці. Журналістыка, на думку Андрэя Крывашэева, з нядаўніх часоў сутыкнулася з новымі пагрозамі. Асабліва актуальна пытанне нейрасеткавых тэхналогій. Хвалі фэйкаў, крадзеж кантэнту, дасканалае кібермахлярства і нават стварэнне лічбавых двайнікоў публічных асоб — журналісцкая супольнасць Беларусі не застаецца ўбаку ад вырашэння гэтых і іншых праблем. У тым ліку ў сферы новых медыя і рабоце з сацыяльнымі сеткамі: TikTok, Instagram, Telegram.

Відавочныя, паводле слоў Андрэя Крывашэева, і выклікі міжнароднага маштабу:

— Бюракраты Еўрасаюза па-ранейшаму працягваюць выносіць супраць нас абсалютна незаконныя, нават з пункту гледжання іх права, рашэнні, у тым ліку ўключаюць нас у санкцыйныя спісы. Мы гэтага не баімся — мы працуем у інтарэсах нашай дзяржавы, нашых людзей.

Дарэчы, з гэтага года БСЖ уключаны ў склад прэзідыума праўлення міжнароднай медыяплатформы «Адзін пояс — адзін шлях» (BRJN), якая аб'ядноўвае два мільёны журналістаў з сотні краін. Гэты статус адкрывае перад беларускімі медыйшчыкамі ўнікальныя магчымасці. У тым ліку — працаваць над умацаваннем салідарнасці і медыяландшафту, стварэннем новых платформаў прамога абмену кантэнтам.

Вынікам маштабнага мерапрыемства стала агульная ўпэўненасць у тым, што ключавыя задачы, якія стаяць сёння перад грамадствам і дзяржавай, будуць вырашаны, а галоўным капіталам сучаснай журналістыкі па-ранейшаму застанецца давер аўдыторыі.

**Аміна НАЗАРАВА.**




антыадмывачная сістэма Беларусі знаходзіцца на высокім узроўні сярод краін — удзельніц ЕАД. «Што датычыцца прыярытэтаў на бліжэйшыя два гады, самая галоўная задача — даць магчымасць краінам — членам ЕАД прайсці ацэнку ФАТФ і пацвердзіць, што наша сістэма адпавядае ўсім міжнародным патрабаванням», — падкрэсліў Юрый Чыханчын.



Сярод дасягненняў Рэспублікі Беларусь, якія з'яўляюцца перадавым вопытам для іншых краін, **дырэктар Дэпартамента фінансавага маніторынгу Камітэта дзяржкантролю Беларусі Дзмітрый ЗАХАРАЎ** найперш назваў прагрэсіўны вопыт ідэнтыфікацыі кліентаў у банкаўскім і іншых сектарах эканомікі, які дазваляе аператыўна вызначаць падазроныя фінансавыя аперацыі, праводзіць работу па далейшым аналізе гэтых аперацый і накіроўваць праваахоўным органам адпаведную інфармацыю для больш дэтальнай прапрацоўкі. Таксама гэта рэгуляванне крыптарынку, які дэтальна рэгламентаваны, што дазваляе мінімізаваць рызыкі ў гэтай сферы. Сярод прагрэсіўных мер і аўтаматызаваная сістэма барацьбы з махлярствам, якая дазваляе па рашэнні праваахоўных органаў аператыўна блакіраваць падазроныя фінансавыя аперацыі, звязаныя з кібермахлярствам і фінансавымі злоўжываннямі, і тым самым папярэджваць вывад сродкаў за мяжу. Гэта і кантроль за ігральным бізнесам, дзе ёсць пэўная сістэма ідэнтыфікацыі і верыфікацыі фінансавых аперацый. Гэты вопыт выклікае цікавасць у міжнароднай супольнасці і абмяркоўваецца на пляцоўцы пленарнага тыдня ЕАД.

**Алена КРАВЕЦ.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении электронных торгов
## № 2025.Б.002.00292

**Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга»** извещает о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **открытому акционерному обществу «Минский завод строительных материалов»**, УНП 100008102, в отношении которого открыто производство по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) № 455-5Б/2018 в экономическом суде г. Минска.

Номер лота, вид выставляемого на электронные торги имущества:

**Лот № 1. Недвижимое имущество.**
**Информация о предмете торгов, в т. ч. местонахождение:**

Кап. строение с инв. № 500/С-31824 площадью 196,4 кв. м по адресу: г. Минск, ул. Янки Мавра, 47/27, наименование: грузопроходная, назначение: здание неустановленного назначения.
Объект расположен на зем. участке с кадастровым № 500000000006004362 по адресу: г. Минск, ул. Янки Мавра. 47/13 (общее долевое право постоянного пользования).
Магазин с инв. № 801.

Сооружение, расположенное на земельном участке с кадастровым № 500000000004362, наименование: площадка около грузовой проходной, общ. пл. 1920,8 кв. м, назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ, по адресу: г. Минск, ул. Янки Мавра, 47/70. Сооружение наименование: площадка № 8 (Проходная), общ. пл. 601,3 кв. м, назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ, по адресу: г. Минск, ул. Янки Мавра, 47/80. Сведения о земельном участке отсутствуют.

Сооружения реализовываются без наличия документов, удостоверяющих их государственную регистрацию, а также без изъятия и предоставления земельных участков, на которых они расположены согласно Указу Президента Республики Беларусь от 23 августа 2024 г. № 333 «Об особенностях работы с имуществом неплатежеспособных организаций».

**Начальная цена:** 543 800,00 бел. руб. без НДС.
**Минимальная цена:** 435 040,00 бел. руб. без НДС.

**Дополнительное условие по лоту № 1:** Покупатель обязан заключить с Продавцом договор купли-продажи на приобретение движимого имущества на общую сумму 279,60 бел. руб. без НДС: вывеска «Бетон» 650*2100 с инв. № 501643 – 1 шт., вывеска магазина с инв. № 501417 – 1 шт., вывеска с объемными буквами и подсветкой с инв. № 500874 – 1 шт., выставочный стенд FOLD UP 3*2 с инв. № 501566 – 1 шт.

**Условия электронных торгов:** Победитель торгов (единственный участник торгов, выразивший согласие на приобретение предмета электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) обязан: в течение 5 дней со дня проведения электронных торгов возместить затраты на организацию и проведение электронных торгов, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам электронных торгов документации, необходимой для их проведения, расходов на проведение независимой оценки с оплатой услуг оператора ЭТП, возместить расходы на проведение технической инвентаризации и изготовление технических документов, возместить затраты на услуги по обмерным работам, получение координат периметра и составления плана земельных участков (площадок) в размере 640,00 бел. руб; подписать договор купли-продажи предмета электронных торгов и заключить договор купли-продажи движимого имущества в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения электронных торгов; оплатить стоимость приобретенного имущества не позднее 10 рабочих дней с даты подписания договоров купли-продажи. Расходы Доверителя на проведение независимой оценки – 2955,20 бел. руб. без НДС, на техническую инвентаризацию и изготовление итоговых технических документов – 2066,67 бел. руб. без НДС.

Размер шага составляет 5 процентов от начальной цены лота. Имеющиеся обременения: нет.

**Дата и время начала и завершения электронных торгов:**
**29.12.2025 с 09.00 до 16.00.**

Электронные торги проводятся на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» по электронному адресу: http://etpvit.by. Организация и проведение торгов осуществляется в соответствии с Инструкцией о порядке организации и проведения электронных торгов по продаже имущества в процедурах экономической несостоятельности (банкротства), утвержденной постановлением Министерства экономики Республики Беларусь от 1 апреля 2019 г. № 9, на основании п. 2 постановления Министерства экономики Республики Беларусь от 15.05.2023 № 9 «Об утверждении форм протоколов по торгам в процедурах несостоятельности или банкротства», вступившим в силу с 01.10.2023, Указом Президента Республики Беларусь от 23 августа 2024 г. № 333 «Об особенностях работы с имуществом неплатежеспособных организаций».

Прием документов осуществляется на электронной торговой площадке по электронному адресу: http://etpvit.by, до **16.00 24.12.2025.**

Для участия в электронных торгах на электронной торговой площадке по электронному адресу: http://etpvit.by – необходимо подать заявку на участие в электронных торгах и пройти аккредитацию в качестве участника электронных торгов, а также перечислить задаток в срок **до 16.00 24.12.2025.**

**Задаток по лоту № 1** в сумме **54 380,00** (пятьдесят четыре тысячи триста восемьдесят рублей 00 копеек) бел. руб. должен быть зачислен на счет коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга», УНП 390477566, р/с BY93MTBK30120001093300066782 в ЗАО «МТБанк», г. Минск, БИК MTBKBY22, код операции 40901.

Победителем электронных торгов признается участник, предложивший максимальную цену за лот.

Справочная информация:
Контактный телефон антикризисного управляющего +375 (17) 360-24-99.
Контактный телефон для осмотра объектов +375 44 7936323.
Контактный телефон лица, организующего торги на основании договора поручения: 8 (0212) 24-63-12, 8 (029) 510-07-63.

Дата, время и адрес доступа (ознакомления) с предметом электронных торгов в рабочие дни с 09.00 до 16.00 по предварительному согласованию с Продавцом по местонахождению имущества.

Затраты на организацию и проведение электронных торгов определяются согласно смете затрат, затраты на обслуживание ЭТП определяются согласно прейскуранту ЭТП. Ознакомление с затратами на организацию и проведение электронных торгов производится на http://etpvit.by до начала торгов.

Возмещение затрат на организацию и проведение электронных торгов осуществляется в соответствии с законодательством



**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)**

**информирует о проведении электронного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Республиканскому унитарному предприятию радиоцентр «Телерадиокомпания «Гродно»**

**Аукцион состоится 29.12.2025 г. в 11.00**
**по адресу: https://gostorg.by**
**Телефон для справок 55-87-71**

| | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | **ЛОТ 1: легковой автомобиль «Шкода Октавия», 1998 г. в.**, гос. № 3075 XI, VIN: TMBZZZ1U8X2148561, цвет зеленый, допустимая полная масса 1680 кг, объем 1595 куб. см, мощность 74 кВт, бензиновый, МКПП 5, пробег 365 633 км. Местонахождение: г. Гродно, ул. Максима Горького, 85А.<br>**ЛОТ 2: легковой автомобиль Volkswagen Passat, 2007 г. в.**, гос. № 0156 АА-4, VIN: WVWZZZ3CZ7E211273, цвет серебристый, допустимая полная масса 2030 кг, объем 2000 куб. см, мощность 110 кВт, бензиновый, АКПП 5, пробег 331 892 км; дополнительный комплект зимних шин на металлических дисках 195/95 R15; 2 новых кузовных передних крыла. Местонахождение: г. Гродно, ул. Максима Горького, 85А |
| **Начальная цена продажи** | Лот № 1: 6 840 руб. (шесть тысяч восемьсот сорок рублей) с учетом НДС 20 %.<br>Лот № 2: 2 169,04 руб. (две тысячи сто шестьдесят девять рублей четыре копейки) с учетом НДС 20 % |
| **Сумма задатка** | Лот № 1: 684 руб. (шестьсот восемьдесят четыре рубля).<br>Лот № 2: 216 руб. (двести шестнадцать рублей) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Шаг электронных торгов** | Обязательный первый шаг аукциона 5 % от начальной цены лота. Последующий шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота |
| **Адрес и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются на сайте ЭТП https://gostorg.by **Последний день приема заявлений – 23.12.2025 г. до 15.00** |
| Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://gostorg.by | |



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ
ПОВТОРНОГО ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
*(организатор торгов и оператор электронной торговой площадки: torgi.rlt.by, местонахождение: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321)*
по поручению
**ОАО «Миноблавтотранс» филиал «Автобусный парк № 2»**
*(продавец, местонахождение: Минская область, г. Слуцк, ул. Транспортная, 3)*

проводит открытый аукцион по продаже

## автобуса (вагон) MAZ 103062,

**регистрационный знак АЕ1385-5, 2008 г. в., кузов (рама) № Y3M10306280003324, инв. № 22004, цвет оранжево-белый, находящегося по адресу: Минская область, г. Слуцк, ул. Транспортная, 3.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **10 320,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **1 032,00** бел. руб.
**Стоимость снижена на 20 %.**

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, OTHR.

Условия аукциона:
- имущество приобретается на условиях 100 % предоплаты и оплаты Покупателем (единственным участником) аукциона комиссионного вознаграждения банку за проведения данного платежа;
- Покупатель обязан за свой счет принять приобретаемое имущество, в том числе осуществление вывоза, хранения, погрузочно-разгрузочных работ;
- на Покупателя возлагается обязанность по переоформлению (в ГАИ, военкомате), снятию и постановке на учет приобретаемого имущества за свой счет.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 10 (десяти) рабочих дней с даты проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Организатор торгов имеет право отказаться от их проведения: в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона.

**Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона оплачивает вознаграждение в размере 10 (десяти) процентов от цены продажи предмета аукциона, а также возмещает затраты на публикацию извещения о проведении торгов.**

Электронные торги проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608 и регламентом электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY», размещенном по адресу: torgi.rlt.by.

Информация о проводимых электронных торгах опубликована на сайтах: au.nca.by, minsk-region.gov.by, rlt.by.

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 20.09.2025.

Электронные торги состоятся **10.12.2025 в 10.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **08.12.2025** до **17.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17.**
**Тел. для осмотра (8029) 358-56-32.**

УНН 601070249



Утерянное свидетельство о государственной регистрации индивидуального предпринимателя на имя Корзуна Ильи Анатольевича, УНП 692034454, **считать недействительным**

## Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Лот № 1:** 1) капитальное строение с инв. № 100/С-61178 (наименование: Корпус № 1; назначение: Здание специализированное для производства машин и оборудования (машиностроения)), площадью 14582,6 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Московская, 202М, на земельном участке с кадастровым номером 140100000001034070, площадью 1,2881 га; 2) Передаточное устройство: капитальное строение с инв. № 100/С-101268 (наименование: Хозфекальная канализация; назначение: Сооружение специализированное коммунального хозяйства), протяженностью 136,1 м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, 291, канализационная сеть; 3) Передаточное устройство: капитальное строение с инв. № 100/С-101270 (наименование: Канализационная дождевая сеть; назначение: Сооружение специализированное коммунального хозяйства), протяженностью 83,5 м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, 289, канализационная сеть; 4) Передаточное устройство: капитальное строение с инв. № 100/С-101263 (наименование: Питьевой водопровод; назначение: Сооружение специализированное коммунального хозяйства), протяженностью 301,3 м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, 298, водопроводная сеть; 5) Передаточное устройство: капитальное строение с инв. № 100/С-101269 (наименование: Канализационная дождевая сеть; назначение: Сооружение специализированное коммунального хозяйства), протяженностью 59,3 м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, 288, канализационная сеть; 6) оборудование ТП 3 в составе: 1. ТКП-1000 Подстанция; мощн. 100кВт, инв. № 81250: а) Трансформатор ТМЗ-1000/6/0,4 кВт, год выпуска 1974 г.; б) Шкаф ШО; 2. КСО-266 Камера распредилит. устройств 10 кВ, год выпуска 1971 г., инв. № 81224; 3. Кабельная линия РП 159-ТП 3,6кВ, АСБ 3*95 L=400 м, инв. № 28.11; 7) оборудование КТП 4 в составе: 1. КТП-1000 Подстанция; мощн. 100 кВт, инв. № 81218: а) Трансформатор ТМЗ-1000/6/0,4 кВт, год выпуска 1969 г.; б) Шкаф ШН-2, 4 шт.; 2. КСО-266 Камера распредилит. устройств 10 кВ, год выпуска 1971 г., инв. № 81235; 3. Кабельная линия РП 159-КТП 4,6кВ, АСБ 3*95 L=420 м, инв. № 28.12; 8) КР93.00.000 Кран подвесной электрический, г/п 2 т, инв. № 154884; 9) Кран подвесной электрический г/с 2 тс, инв. № 791015; 10) Кран подвесной электрический г/с 2 тс, инв. № 791010; 11) Кран подвесной электрический г/с 2 тс, инв. № 791009; 12) КР93.00.000 Кран подвесной электрический 2/П2Т, инв. № 791001; 13) Кран-балка подвесная г/п 1,0 т, инв. № 791007; 14) Кран-балка подвесная г/п 1,0 т, инв. № 791006; 15) Р2-БМ-1307 стеллаж механизированный б/трансманипулятора оргоснастка, инв. № 154345; 16) Таль электрическая CD1/6, г/п 1 т, инв. № 793118; 17) ВО92М электротельфер, инв. № 793048; 18) Р2-НО-49 Кран балочный, г/п 3,2 т, инв. № 153152; 19) ТС-15 Кран-штабелер, инв. № 154353; 20) ТС-15 Кран-штабелер, инв. № 154352; 21) Р2-БМ-842 склад элеваторного типа, инв. № 135021; 22) Р2-БМ-842 склад элеваторного типа, инв. № 135020; 23) Р2-БМ-842 склад элеваторного типа, инв. № 135019; 24) Р2-БМ-842 склад элеваторного типа, инв. № 135018; 25) Р2-БМ-842 склад элеваторного типа, инв. № 135017; 26) Р2-БМ-842 склад элеваторного типа, инв. № 135016; 27) Ворота секционные СП 4000*4200 RAL9006 K, год выпуска 2010 г., инв. № 158170; 33) капитальное строение с инв. № 100/С-55259 (наименование: Переходная галерея; назначение: Здание административно-хозяйственное), площадью 146,8 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Московская, 202Б/5, на земельном участке с кадастровым номером 140100000001005815, площадью 7,9791 га.

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Начальная цена, руб. (без учета НДС)** | **3 689 406,54** | **Размер задатка, руб.** | **368 940,65** |

**Продавец:** ОАО «БЭМЗ», 224020, г. Брест, ул. Московская, 202, тел./факс 80162340004.
**Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701.
Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления.
**Р/с для перечисления задатка:** р/с BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ №116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901.
**Назначение платежа:** Задаток за участие в аукционе по продаже объекта ОАО «БЭМЗ».
**Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 30 рабочих дней со дня проведения аукциона.
**Условия продажи:** без условий.
**Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи.
Информация о возмещении затрат: участник аукциона, выигравший торги, в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона.
**Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона.
**Обременения:** наличие действующих договоров аренды

**Аукцион состоится 17 декабря 2025 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона **www.ocenkabrest.by**, а также можно узнать по телефонам: **8 (0162) 40-87-01, 40-87-41**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема – 16 декабря 2025 г. до 17.00**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор электронных торгов** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390. Тел. +375 17 310-36-37 |
| **Продавец** | РО «БЕЛАГРОСЕРВИС», г.Минск, ул.Козлова, д.25а. УНП 190431542 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, 40, пом. 46, оф. 1. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронных торгов**

**Трактор «Беларус-1221 В», заводской № 12008885, 2004 г. в.**
Местонахождение: Минский р-н, г. Фаниполь, ул. Заводская, 29а

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 18 975,00 бел. руб.**
Шаг торгов – 5 % от текущей цены

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета торгов перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (BYN), БИК BELBBY2X. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки». УНП 191 021 390

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** после проведения аукциона

**Срок оплаты предмета аукциона: 10 (десять) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 30.12.2025 с 11.00 до 11.10.**
**Дата и время окончания приема заявок: 29.12.2025** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» (ipmtorgi.by)

**Извещение о проведении электронных торгов опубликовано на сайте Государственного комитета по имуществу (gki.gov.by)**

**Контактные телефоны:** +375(17)310-36-37; +375(29)154-34-35.
**E-mail:** auction@cpo.by

# «КОСМАС» СЛУЖБЫ БЫТУ

## Як навучальны працэс Гомельскага каледжа стаў часткай тэхналагічнага ланцужка прадпрыемстваў

Вучэбныя швейныя майстэрні тут мала чым адрозніваюцца ад цэхаў на профільным прадпрыемстве, а будучыя цырульнікі ўдасканальваюць свае навыкі не на манекенах, а ва ўмовах, максімальна набліжаных да салона прыгажосці. Сваім досведам, як рыхтаваць спецыялістаў, гатовых да работы на сучаснай вытворчасці і ў сферы паслуг, са «Звяздой» з задавальненнем падзялілася творчая педагагічная каманда Гомельскага дзяржаўнага каледжа бытавога абслугоўвання.




### Упор на практыку

У швейнай майстэрні пахне новым тэкстылем... Пад роўны гул машын дзяўчаты-навучэнцы ўважліва працуюць над пашывам штаноў для хлопчыкаў. І гэта не вучэбныя ўзоры, а рэальны раскрой паяснога вырабу школьнага дзелавога стылю ад ААТ «Камінтэрн».

На бясспрэчнай важнасці практыка-арыентаванай падрыхтоўкі спецыялістаў для лёгкай прамысловасці робіць акцэнт **дырэктар Гомельскага дзяржаўнага каледжа бытавога абслугоўвання Аляксандр ГУРЫН.**

— Гэта тое, што называюць найвышэйшым пілатажам у прафадукацыі. Не проста вучэбнае заданне, а адказнасць перад рэальным заказчыкам, — заўважае Аляксандр Леанідавіч. — З прапановай такой формы ўзаемадзеяння да нас звярнулася гендырэктар «Камінтэрна» Таццяна Літвіновіч, а мы ахвотна падтрымалі ініцыятыву. Асноўная задача — уключыць у навучальны працэс пашыў вырабаў прадпрыемства. Даецца гатовы раскрой дзіцячых штаноў, і на вучэбных занятках навучэнцы шыюць рэальную прадукцыю. Так вытворчы працэс фабрыкі інтэграваны ў нашу вучэбную праграму.

Яшчэ адзін прарыў у навучанні — стварэнне вучэбнай майстэрні наўпрост у цэху ААТ «8 Сакавіка». У рамках сеткавага ўзаемадзеяння навучэнцы каледжа праходзяць вытворчае навучанне не ў класах, а на рэальным працоўным месцы.

### Вучоба без межаў

У арганізацыі формаў навучання каледж максімальна арыентаваны на патрэбы рэгіёна і яго жыхароў. Выдатны прыклад — аддзяленне перападрыхтоўкі дарослага насельніцтва. Працуюць з усімі жадаючымі на платнай аснове. Таксама вучаць новай спецыяльнасці па накіраванні цэнтраў занятасці. Такія праграмы скарочаныя, каля паўгода, і фарміруюцца індывідуальна, з улікам базавай адукацыі чалавека.

Каледж таксама забяспечвае прафесійную падрыхтоўку школьнікаў. Штогод каля 200 старшакласнікаў Гомеля атрымліваюць тут працоўныя прафесіі, як некалі ў навучальна-вытворчых камбінатах.

Асобны і асаблівы кірунак дзейнасці каледжа — філіял у Гомельскай папраўчай калоніі №4.

— Мы рыхтуем асуджаных па швейным і цырульніцкім профілях. І сёння выходзім на новы ўзровень: упершыню ў Беларусі на базе філіяла калоніі пачынаецца падрыхтоўка па праграмах сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Гэта запатрабавана, і мы ўжо скарэкціравалі ўсе навучальныя планы для першага набору. Нас выбралі эксперыментальнай пляцоўкай укаранення падобнай практыкі навучання па ініцыятыве Дэпартамента выканання пакаранняў МУС і міністэрства адукацыі, — звяртае ўвагу Аляксандр Гурын.

### Кадры для краіны

У каледжы двухузроўневая сістэма падрыхтоўкі. Першая ступень — прафесійна-тэхнічная падрыхтоўка: цырульнікі, швачкі, краўцы, майстры па манікюры. Другая ступень — сярэдняя спецыяльная адукацыя: мастакі-мадэльеры і мадэльеры-канструктары, якія навучаюцца па профілях «Цырульнае мастацтва і дэкаратыўная касметыка» і «Мадэляванне і канструяванне швейных вырабаў». На першую і другую ступень навучання — набор толькі пасля 9-га класа.

— Як паказала сёлетняя прыёмная кампанія, дзеці прыходзяць матываваныя. Конкурс дасягаў два чалавекі на месца па спецыяльнасці «Мастак-мадэльер», і 1,2-1,3 чалавека на месца — «Мадэльер-канструктар», — тлумачыць **намеснік дырэктара Гомельскага дзяржаўнага каледжа бытавога абслугоўвання Яўгенія ЯМПОЛЬСКАЯ.** — У нас адпрацаваны механізм работы па мэтавай падрыхтоўцы навучэнцаў не толькі з дзяржаўнымі, але і прыватнымі прадпрыемствамі і арганізацыямі. Увесь кантынгент навучэнцаў і колькасць груп фарміруем на аснове дзяржзаказу кадраў праз аўтаматызаваную сістэму. Працуем з заказчыкамі кадраў па ўсёй краіне, але асноўны партнёр — Гомельская вобласць: нашы вядомыя фабрыкі, камбінаты бытавога абслугоўвання, прыватныя прадпрыемствы.

### ШІ для будучых мадэльераў

Сёння, без перабольшвання, гонар для Гомельшчыны — цэнтр кампетэнцый па швейнай вытворчасці на базе Гомельскага дзяржаўнага каледжа бытавога абслугоўвання. Цэнтр быў створаны тут яшчэ ў 2012 годзе, але сёлета ў межах рэалізацыі дзяржпраграмы развіцця прафесіянальна-тэхнічнага навучання гэту навучальную пляцоўку кардынальна абнавілі. Сёння гэта адзіны ў краіне цэнтр кампетэнцый па швейнай вытворчасці такой высокай ступені аснашчанасці.

— Гэта прарыў не толькі для нас, але і для ўсяго рэгіёна, — падкрэслівае дырэктар Аляксандр Гурын. — Мы сталі рэгіянальнай пляцоўкай — па дамове аб сеткавай форме ўзаемадзеяння да нас на навучанне прыязджаюць маладыя людзі з усіх аднапрофільных каледжаў вобласці. Калі раней у нас праходзіла навучанне 70—100 чалавек у год, то на гэты год запланавана ўжо 339 чалавек. Цэнтр абсталяваны тэхнікай найвышэйшага класа. Я б сказаў, гэта «космас». І што важна — абсталяванне цэнтра на парадак вышэй, чым на многіх прадпрыемствах, што дазваляе нам перайсці на ўзровень апераджальнай падрыхтоўкі кадраў, даваць веды і навыкі, якія будуць запатрабаваны яшчэ доўгія гады. Акрамя таго, магчымасці цэнтра плануецца выкарыстоўваць для перападрыхтоўкі майстроў вытворчага навучання і павышэння кваліфікацыі работнікаў швейных прадпрыемстваў.

### Урокі дабрыні

Не менш цікавую форму практыка-арыентаванага навучання тут укараняюць для цырульнікаў. Выбудавана ўнікальная сістэма абслугоўвання насельніцтва. Любы жыхар горада можа запісацца і прыйсці на ўрок, дзе навучэнцы пад наглядам майстра аказваюць цырульніцкія паслугі. Гэта бясплатна. Важна, што будучыя спецыялісты не толькі адпрацоўваюць навыкі на «жывой мадэлі», але і вучацца камунікаваць з рознымі кліентамі. І такая практыка вельмі запатрабаваная — штодня ў каледж па такую паслугу звяртаецца 100—120 чалавек.

Каледж вядомы і сваёй валанцёрскай дзейнасцю. Навучэнцы рэгулярна выязджаюць з майстар-класамі ў дзіцячыя дамы, школы-інтэрнаты, сацыяльныя цэнтры, пансіянаты для пажылых людзей, састарэлых і інвалідаў: бясплатна стрыгуць і робяць укладкі.

— За гады работы з навучэнцамі мы пераканаліся: каб выхаваць прафесіянала і патрыёта, які разумее сваю адказнасць перад краінай, — стандартнага вучэбнага працэсу недастаткова. З 2008-га захапіліся ўдзелам у конкурсах прафмайстэрства. Гэты досвед дазволіў укараніць і новыя методыкі: каб запоўніць паўзы паміж буйнымі конкурсамі, прыдумваем уласныя творчыя праекты, дзе студэнты дэманструюць сваё майстэрства, — тлумачыць Аляксандр Гурын.

Толькі за апошнія 10 гадоў навучэнцы і педагогі заваявалі больш за 200 прызавых месцаў на міжнародных конкурсах, а іх чэмпіёны — найлепшыя выпускнікі — вяртаюцца ў родны каледж ужо выкладчыкамі. Сёння 70 % педработнікаў каледжа — яго выпускнікі.

Тое, наколькі жаданне вучыцца і працаваць важна для любога чалавека, творчая педагагічная каманда Гомельскага дзяржаўнага каледжа бытавога абслугоўвання адлюстравала ў лозунгах пры ўваходзе і выхадзе. Калі перасякаеш парог, чытаеш: «Помнім мінулае, шануем сучаснасць, думаем аб будучыні». А калі ідзеш дадому пасля вучобы, працы, нагадваеш сабе: «Будучыня залежыць ад таго, што ты паспееў зрабіць сёння».

— Паміж гэтымі дзвюма фразамі і заключаны ўвесь наш цікавы, практыка-арыентаваны навучальны працэс па падрыхтоўцы не проста спецыялістаў, а паспяховых прафесіяналаў і патрыётаў сваёй краіны, — матывуе на творчы падыход у любой справе калектыў Гомельскага дзяржаўнага каледжа бытавога абслугоўвання.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА,**
**фота аўтара.**

# КАЛІ ДЗІЦЯЦІ НЕ САЛОДКА...

## Булінг і кібербулінг — што трэба ведаць бацькам

«Я сам вінаваты, я гэта заслужыў» — такая ўстаноўка можа сфарміравацца ў дзіцяці, якое стала ахвярай сістэматычнага здзекавання, або булінга. Яшчэ больш дзіцячая жорсткасць раскрываецца пад маскай ананімнасці ў інтэрнэце. Чым небяспечны булінг, асабліва ў сацсетках, і чаму яго нельга ігнараваць, тлумачыць медыцынскі псіхолаг, загадчыца псіхалагічнай лабараторыі Мінскага гарадскога клінічнага цэнтра дзіцячай псіхіятрыі і псіхатэрапіі Вольга НАВУМЕНКАВА.



***— Вольга Васільеўна, у чым прынцыповая розніца паміж булінгам і звычайнай дзіцячай ці падлеткавай сваркай?***

— Сварка, як правіла, спантанная, без папярэдняга намеру. Да таго ж яна дастаткова хутка вырашаецца альбо самімі дзецьмі, альбо з дапамогай дарослых. Пасля такога канфлікту бакі або працягваюць мець зносіны, або аддаляюцца адзін ад аднаго. Як кажуць, сёння пасварыліся, а заўтра ўжо гуляюць разам.

А вось булінг мэтанакіраваны і сістэмны. Гэта не «бяскрыўдныя абзывалкі», як часам лічаць дарослыя, а агрэсіўныя паводзіны, ігнараванне, знявага ў адносінах да дзіцяці, якія ніколі не праходзяць самі. Аб'ектам цкавання часта становяцца па нейкай прычыне заіканне, знешні выгляд дзіцяці, яго інтэлектуальныя ці фізічныя асаблівасці, нават банальнае раздражненне і зайздрасць да яго поспехаў і дасягненняў. Сістэматычная траўматызацыя адбываецца на ўсіх узроўнях: інтэлектуальным, эмацыйным, асобасным, сацыяльным.



***— Для якой узроставай групы характэрна з'яўленне булінгу?***

— Часцей за ўсё цкаванне пачынаецца з малодшых падлеткаў, у 10—12 гадоў. У пачатковай школе дзеці яшчэ больш-менш аднолькавыя, дастаткова моцны бацькоўскі кантроль. Калі сацыяльная іерархія становіцца больш прыкметнай, запускаюцца механізмы булінгу. Дарэчы, у яго ёсць тры складнікі: агрэсар (той, хто буліць), ахвяра (каго буляць) і сведкі. Прычым апошнія, як і ахвяра, атрымліваюць псіхалагічную траўму. Яны назіраюць за тым, што адбываецца, і, так ці інакш, становяцца ўдзельнікамі працэсу. Увагі з боку бацькоў і спецыялістаў патрабуе і дзіця-агрэсар.

***— Чаму дзіця наогул ім становіцца?***

— У нейкі момант ён разумее, што ролю лідара класа можна атрымаць за кошт цкавання больш слабага — зарабіць такім чынам «ачкі». У класе, дзе ўсе вучацца прыкладна аднолькава, чым яшчэ вылучыцца? Затым паступова вакол такога дзіцяці фарміруецца група падтрымкі. Іх логіка таксама простая: так складаней самому аказацца на месцы ахвяры.

***— А як распазнаць ахвяру?***

— Па-першае, пакутуе эмацыйны стан дзіцяці: ахвяра цкавання часта становіцца альбо вельмі замкнёнай, альбо, наадварот, залішне плаксівай, няўпэўненай у сабе. Дзіця можа пачаць сябе крытыкаваць: «са мной ніхто не сябруе, таму што я вось такі», «мяне крыўдзяць, таму што я дрэнна вучуся/нязграбны» і г. д. Па-другое, рэзка круг зносін — ажно да поўнай ізаляцыі. У рэшце рэшт пагаршаецца вучоба: у стане хранічнага стрэсу і трывогі вучыцца на ранейшым узроўні становіцца вельмі складана.

***— Якія наступствы школьнага цкавання?***

— Патуранне з боку дарослых, пазіцыя «дзеці самі разбяруцца» толькі пагаршаюць сітуацыю. Калі агрэсара ніхто не спыняе і не заве рэчы сваімі імёнамі, у яго замацоўваецца наступная мадэль паводзін: «я магу атрымаць жаданае такім спосабам, фізічнай сілай». Ён не шукае іншых шляхоў для ўзаемадзеяння са светам.

Калі ж не працаваць з ахвярай, у яе фарміруецца пазіцыя: «я сам вінаваты, я гэта заслужыў, бо недастаткова добры, разумны, моцны». Гэта можа праецыравацца і на дарослае жыццё. Такі чалавек не ўмее казаць «не», робіць тое, што яму не падабаецца. Таму ахвярам булінгу часта патрэбна дапамога спецыялістаў. Вырашыць праблему часам дапамагае і перавод у іншую навучальную ўстанову.

Са сведкамі, каб тыя не заставаліся ў гэтай маўклівай ролі па жыцці, таксама трэба працаваць: тлумачыць, што добра, а што дрэнна, што такое агрэсія, чаму важна дапамагаць, не заставацца ўбаку. Увогуле, булінг з'яўляецца не ў адзін дзень, і таму не за адзін дзень праблема і вырашаецца.

***— У чым сутнасць і небяспека кібербулінгу?***

— Пад аватаркай у сацыяльнай сетцы можа быць хто заўгодна. Таму і агрэсіі ад «ананіма» больш, эфект нечаканасці — мацнейшы. На пэўных стадыях агрэсар у сетцы збірае дастаткова шмат асабістай інфармацыі аб дзіцяці, і потым менавіта ёй яго запалохвае і нават шантажыруе. Гэта могуць быць асабістыя фатаграфіі, любая іншая кампраметуючая інфармацыя.

Варта адзначыць, што, як гэта ні парадаксальна, фізічны булінг у шэрагу выпадкаў пераносіцца лягчэй, чым псіхалагічны. Дзіця праводзіць у школе вялікую колькасць часу, і калі з дня ў дзень яно падвяргаецца прыніжэнням, ігнараванню, слоўным здзекам — гэта на парадак цяжэй і траўматычней для яго псіхікі. Тое ж самае датычыцца і булінгу ў інтэрнэце. З дзецьмі, якія сталі яго ахвярамі, таксама павінны працаваць псіхолагі, і, вядома, ім проста неабходна падтрымка і разуменне з боку бацькоў.

***— Як дзіцяці не стаць аб'ектам цкавання ў інтэрнэце?***

— Тут вельмі важная прафілактыка, прычым пачынаць трэба з бацькоў. Справа ў тым, што сёння значная частка нашага жыцця праходзіць анлайн, і дарослыя часта самі легкадумна ставяцца да ўласнай бяспекі. Таму трэба спачатку навучыцца самім, а потым навучыць сваё дзіця базавым правілам паводзін у сацыяльных сетках. Што датычыцца кібербулінгу, галоўнае — гэта не выкладваць канфідэнцыяльныя фота і відэа ў інтэрнэт. Ні ў агульны доступ, ні ў асабістых перапісках. Трэба разумець: усё, што трапіла ў інтэрнэт, застанецца там назаўжды.

І, канешне, павінен быць давер паміж бацькамі і дзецьмі. Ніхто не адмяняў і бацькоўскі кантроль на тэлефоне або камп'ютары — гэта не залішняя апека, а неабходнасць. У дзіцяці яшчэ няма жыццёвага вопыту, тых унутраных маркераў, якія падказваюць, што бяспечна, а што не. Да пэўнага ўзросту гэту бяспеку павінны забяспечваць бацькі.

***— Па вашых назіраннях, ці дастаткова ўдзяляецца ўвагі праблеме з боку дарослых?***

— Сучасныя бацькі і выкладчыкі значна больш уважлівыя да дзяцей і іх узаемаадносін паміж сабой. І гэта нядзіўна: шмат інфармацыі для вывучэння пытання ёсць у адкрытым доступе. Бацькам больш не трэба ісці ў бібліятэку, любую параду ён можа «загугліць». Ды і самі дзеці змяніліся: цяперашняе пакаленне схільна часцей вербалізаваць свае пачуцці, эмоцыі. Дзеці імкнуцца расказаць, што з імі адбываецца, падзяліцца перажываннямі ў тых жа сацсетках, калі з бацькамі няма «кантакту». Па тых жа сацыяльных сетках і перапісках дарослыя — у тым ліку і праваахоўныя органы — могуць вылічыць крыўдзіцеляў. Такім чынам, праблема булінгу — і ў рэальным свеце, і ў віртуальным — становіцца бачнай. А значыць, на яе можна і трэба рэагаваць.

**Аміна НАЗАРАВА.**
**Фота з адкрытых крыніц.**

### ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Открытое акционерное общество**
**«Дорожно-строительный трест № 3»**
**15 декабря 2025 года в 11.00**
проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества

| № п/п | Сведения о предмете аукциона | Начальная цена продажи со снижением на 60 % без НДС, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Автомобиль «GEELY EMGRAND GT», тип ТС – легковой седан (sedan), год выпуска – 2017, регистрационный знак 0725 IB-6, кузов (рама) № Y4K9944ZXHB000166, цвет ТС – черный, инвентарный № 3329 | 13280,00 | 1328,00 |
| Лот № 3 | Экскаватор «JCB JS220SC», год выпуска – 2011, регистрационный знак ТК-6 1689, заводской номер JSBJS22DK01460883, инвентарный номер № 874 | 46400,00 | 4640,00 |

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его место нахождения и контактные телефоны: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел. 802220712424.
2. Дата, время и место проведения аукциона: **15 декабря 2025 года в 11.00** по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, конференц-зал.
3. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: Положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества, находящегося в собственности ОАО «ДСТ № 3» (утверждённое приказом генерального директора № 5 от 03.01.2022).
4. Участник аукциона за 3 рабочих дня до проведения аукциона должен подать заявление на участие в аукционе, подписать с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, а также перечислить организатору аукциона задаток в размере 10 % от первоначальной стоимости без НДС. Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с BY54BPSB30121192410119330000 код BPSBBY2X в ОАО «Сбер Банк», УНП 700049607.
5. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: 212022, г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; дата: **12.12.2025 г., время: 17.00.**
6. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.
7. Сроки подписания договора купли-продажи: Договор купли-продажи имущества должен быть подписан победителем аукциона (претендентом на покупку) в редакции организатора аукциона после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона и предоставления организатору аукциона копий платежных документов, но не позднее 5 рабочих дней.
8. Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона: в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола.
9. Извещение о проведении предыдущего аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 3» размещено в газете «Звязда» 04.10.2025 и на сайте ОАО «ДСТ № 3».

### ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
*(организатор торгов и оператор электронной торговой площадки: torgi.rlt.by, местонахождение: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321)*
по поручению **ОАО «Минoблавтотранс» филиал «Автомобильный парк № 12»**
*(продавец, место нахождения: Минская область, г.п. Плещеницы, пер. Промышленный, 10)*
проводит открытый аукцион по продаже:

**Лот № 1:**
**автомобиль грузовой седельный тягач МАЗ-544008-060-031, 2013 г. в., регистрационный знак АО 2738-5, рама № Y3M544008D0006952, цвет синий.**
**Начальная цена с НДС (20 %) – 22 176,00 бел. руб.**
Задаток 10 % от начальной цены – **2 217,00 бел. руб.**
**Стоимость снижена на 20 %.**

**Лот № 2:**
**полуприцеп бортовой тентовый МАЗ-975830-(3012), 2013 г. в., регистрационный знак А 6290 В-5, рама № Y3M975830D0006162, цвет серый.**
**Начальная цена с НДС (20 %) – 8 736,00 бел. руб.**
Задаток 10 % от начальной цены **– 873,00 бел. руб.**
**Стоимость снижена на 20 %.**

Транспортные средства расположены по адресу: Минская область, г.п. Плещеницы, пер. Промышленный, 10.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, OTHR.

Условия аукциона:
- имущество приобретается на условиях 100 % предоплаты и оплаты Покупателем (единственным участником) аукциона комиссионного вознаграждения банку за проведение данного платежа;
- Покупатель обязан за свой счёт принять приобретаемое имущество, в том числе осуществление вывоза, хранения, погрузочно-разгрузочных работ;
- на Покупателя возлагается обязанность по переоформлению (в ГАИ, военкомате), снятию и постановке на учёт приобретаемого имущества за свой счёт.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 10 (десяти) рабочих дней с даты проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Организатор торгов имеет право отказаться от их проведения: в любое время, но не позднее, чем за три дня до наступления даты проведения аукциона.

**Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона оплачивает вознаграждение в размере 10 (десяти) процентов от цены продажи предмета аукциона, а также возмещает затраты на публикацию извещения о проведении торгов.**

Электронные торги проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608 и регламентом электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY», размещенным по адресу: torgi.rlt.by.

Информация о проводимых электронных торгах опубликована на сайтах: au.nca.by, minsk-region.gov.by, rlt.by. Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 09.08.2025.

Электронные торги состоятся **10.12.2025** в **10.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие* и необходимые документы принимаются по **08.12.2025** до **17.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17.**
**Тел. для осмотра: (8029) 773-08-86.**
УНП 601070371

# «ЕС — НЕ САЮЗ МАРЫ»

## Новая польская рэальнасць: прызнанне аднаполых шлюбаў і закрыццё дзіцячых садкоў



**Ой, неспакойна ў польскім каралеўстве, неспакойна... усе гэтыя еўрапейскія псеўдакаштоўнасці не па душы простым палякам, ды і некаторым ключавым постацям з кіраўніцтва краіны. Ці сведчыць гэта, што прыходзіць паступовае працверажэнне ад таго еўрапейскага флёра, у які пагрузілася краіна на першых этапах свайго ўдзелу ў саюзе? Магчыма. Але ўсё часцей і часцей пачынаюць гучаць размовы з разраду «а яно нам трэба?». І заўважым, на тое ёсць падставы.**

### «ЗЯЛЁНЫ КУРС» ЕС — ІДЭАЛАГІЧНАЕ ВАР'ЯЦТВА

На днях прэзідэнт Польшчы Караль Наўроцкі, выступаючы ў Карлавым універсітэце ў Празе, заклікаў да рэформаў, якія дадуць дзяржавам — удзельцам ЕС — больш шырокія паўнамоцтвы.

— ЕС — гэта наша натуральнае палітычнае асяроддзе. Але павінен сказаць, што гэта не саюз нашай мары, — выступіў з крытыкай Наўроцкі.

Паводле яго слоў, пры ўступленні ў саюз Польшча чакала эканамічных магчымасцяў і свабоды перамяшчэння, а не таго, што ён назваў умяшаннем у палітычную сістэму краіны, судовую сістэму або заканадаўства аб сямейным жыцці. Ён таксама раскрытыкаваў «зялёны курс» ЕС, які наносіць шкоду эканоміцы і сельскай гаспадарцы.

Палітык назваў «ідэалагічным вар'яцтвам» тых, хто імкнецца да культурных і экалагічных рэвалюцый. Акрамя таго, ён заклікаў спыніць практыку канфіскацыі інстытутамі ЕС паўнамоцтваў у дзяржаў-членаў.

— Неабходна адмовіцца ад празмерных амбіцый па рэгуляванні жыцця дзяржаў-членаў і іх грамадзян, фарміраванні дзяржаўнай палітыкі ва ўсіх абласцях, паколькі такая цэнтралізацыя прыводзіць да ігнаравання волі народа, — сказаў Наўроцкі.

### «ПРЫЗНАЙЦЕ НАШ САЮЗ»...

У якасці адной з прычын яго абурэння можна прывесці нядаўнюю сітуацыю з прымусам Польшчы да прызнання аднаполых шлюбаў. Для кансерватыўнай каталіцкай Польшчы гэта сапраўды як аплявуха.

А цяпер — да сутнасці спрэчнага моманту. Паводле інфармацыі BBC, Еўрапейскі суд абавязаў усе краіны ЕС прызнаваць аднаполыя шлюбы, заключаныя ў краінах саюза. У рашэнні Еўрапейскага суда гаворыцца, што адмова прызнаваць аднаполыя шлюбы парушае правы на свабоду перамяшчэння і пражывання, а таксама права на прыватнае жыццё. То бок па нацыянальным заканадаўстве (у прыватнасці, Польшчы) не прадугледжана рэгістрацыя такіх шлюбаў, але па рашэнні вышэйшага суда ЕС краіна абавязана (!) прызнаваць такія саюзы.

Падставай да разгляду ў судовай інстанцыі стала справа аднаполай пары палякаў, якія ціха сабе мірна жылі ў Германіі і заключылі там шлюб. Але раптам парачка вырашыла вярнуцца на радзіму і паспрабавала зарэгістраваць шлюб у грамадзянскім рэестры, на што атрымала адмову, бо Польшча не прызнае аднаполых саюзаў. Пакрыўджаныя такім становішчам рэчаў партнёры (язык не паварочваецца назваць іх сям'ёй) пабеглі ў Еўрапейскі суд, маўляў, ратуйце, хуліганы правоў радасці жыцця пазбаўляюць. І вось самы гуманны суд у Еўропе пастанавіў, што адмова польскіх улад супярэчыць заканадаўству ЕС. І нават пісульку дасклаў з адпаведным тлумачэннем: «Калі грамадзяне ЕС ствараюць сям'ю ў прымаючай іх краіне Еўрасаюза, у прыватнасці шляхам заключэння шлюбу, яны павінны быць упэўнены ў тым, што змогуць працягваць сямейнае жыццё ў краіне ЕС, з якой яны родам».

Так што Польшчу паставілі перад фактам — калі хочаце быць краінай Еўрасаюза, то забудзьцеся аб сваім нацыянальным заканадаўстве і турбуйцеся лепш аб правах гомасексуалістаў.

І ў такой рэальнасці даводзіцца жыць простым польскім грамадзянам. Глядзіш — і неўзабаве ў каталіцкіх храмах Польшчы пачнуць вывешваць «вясёлкавыя» сцягі і вянчаць у парушэнне Біблії гомасексуальныя шлюбы. Бо менавіта такія маральныя «каштоўнасці» насаджае Еўрасаюз сваім удзельнікам...

Такая цяперашняя рэальнасць, з якой даводзіцца жыць простым польскім грамадзянам. Глядзіш, такімі тэмпамі і іншыя «вясёлкавыя» каштоўнасці пачнуць прывіваць польскаму грамадству. У судовым парадку. Так і да вымірання, як маман-там, не далёка будзе — няма каму будзе размнажацца...

### ... А ДЗЯЦЕЙ УСЁ МЕНШ І МЕНШ

Хоць гэты працэс ужо пануе ў польскім грамадстве. Днямі ў Варшаве абвясцілі пра закрыццё дзіцячых садкоў адразу ў некалькіх гарадскіх мікрараёнах. Прычына — недахоп дзяцей.

Як паведамляе БелТА са спасылкай на польскія СМІ, віцэ-мэр Варшавы Рэната Казноўска агучыла несуцяшальную дэмаграфічную сітуацыю ў польскай сталіцы. Калі ў 2017 годзе ў Варшаве нарадзіліся 19 тысяч дзяцей, то ў 2025-м — толькі 11 тысяч. Па словах чыноўніцы, няма падстаў меркаваць, што сітуацыя ў бліжэйшыя гады палепшыцца.

— Паводле прагнозаў на 2027 год, колькасць нованароджаных скароціцца да 9 тысяч, — адзначыла яна.

Адсюль і такое непапулярнае рашэнне. Варшаўскія мікрараёны Сярэдмесце або Прага Полудне ў хуткім часе могуць апынуцца без адзінага дзіцячага садка.

Наступствы дэмаграфічнага крызісу спачатку адчуюць польскія дзіцячыя садкі, а пазней ён будзе панаваць і ў школах. І вось што цікава: калі такая сітуацыя ў сталіцы, дзе традыцыйна канцэнтруецца вялікая колькасць насельніцтва, то як ідуць справы ў глыбінцы? Нешта падказвае, што наогул катастрафічна...

### АРОЛ НЕ ПАЛЯЦЕЎ (І НАВАТ НЕ ПАПЛЫЎ)

Зразумела, не ад добрага жыцця пакутуе сацыяльная сфера, прычым усе яе кірункі: ахова здароўя, адукацыя, культура. А прычына адна — польскія ўлады замест сацыяльнай падтрымкі сваіх грамадзян, паляпшэння іх дабрабыту ўсе сродкі накіроўваюць на мілітарызацыю краіны. Аднак карупцыя ў тым жа міністэрстве абароны Польшчы ці ў абаронным сектары эканомікі дасягнула такіх памераў, што нават тыя грошы, якія выдзяляюцца, не заўсёды даходзяць да канкрэтнага адрасата. Напрыклад, нядаўна адзіная падводная лодка польскіх ваенна-марскіх сіл ORP Orzel (Арол — польск.) падчас выхаду ў мора для ўдзелу ў парадзе ВМС краіны на Дзень незалежнасці... чарговы раз выйшла са строю.

Па паведамленні польскага партала Onet, субмарына была пабудавана яшчэ ў часы СССР і перададзена польскім ВМС у 1986 годзе. За 40 гадоў эксплуатацыі яна выпрацавала свой рэсурс і патрабавала дарагога абслугоўвання. У 2024-м лодка ўжо праходзіла працяглы рамонт, але, мяркуючы па ўсім, праз раскрадзеныя сродкі ўсе аднаўленчыя работы правялі толькі на паперы. Цяпер субмарыне патрэбны будзе яшчэ адзін рамонт і адпаведна чарговае распілоўванне польскімі чыноўнікамі грошай.

